
ЯК ЗНАЙСЦІ ПАДЫХОД ДА ПАДЛЕТКА 5

ШТО РАБІЦЬ З БЯССОННІЦАЙ? 8


Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

3 САКАВІКА 2021 г. СЕРАДА № 40 (29409)

**ЦЫТАТА ДНЯ**



**Валерый БЕЛЬСКІ, памочнік Прэзідэнта па пытаннях развіцця фінансава-крэдытнай сістэмы:**

*«Тыя задачы, якія пастаўлены праектам Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця, вельмі шырокія. І адна з іх — рэалізацыя творчага патэнцыялу, цыклічнасць і паглыбленне адукацыйнага працэсу. У нас для гэтага ёсць уся неабходная база, высокакваліфікаваныя выкладчыкі — мы ўжо шмат зрабілі, але наперадзе яшчэ чакае вялікая работа. У нашай краіне ёсць усе неабходныя рэзервы для развіцця запатрабаванай і сучаснай адукацыі. Мы ствараем машыны і розную тэхніку, развіваем медыцыну і фармацэўтыку, у нас працуе атамная станцыя, якую абслугоўваюць галоўным чынам нашы суайчыннікі, — без належнай падрыхтоўкі і ведаў гэта ўсё было б немагчыма. У нас адукаваныя, матэнакіраваныя дзеці, якія ўвесь час развіваюцца. І я ўпэўнены, што нас чакае пасляховая будучыня ва ўсіх сферах».*

## З глыбінь беларускай зямлі



Фота БелТА.

**Бурыльшчык Мірон ІЛЬКІЎ з нафтай новага радовішча.**

На нафтавай карце краіны з'явілася новае радовішча. Яно было адкрыта нядаўна ў Хойніцкім раёне на глыбіні больш чым 4,2 тысячы метраў. Гэты прыток, як мяркуецца, здольны даваць 20 тон гаручага выкапня ў суткі.

Па палічках

## ПРА СВАЕ ДАХОДЫ ЛЕПШ НЕ ЗАБЫВАЦЬ

**Штогод каля 30 тысяч жыхароў нашай краіны прадстаўляюць падатковыя дэкларацыі па выніках года. Тэрмін падачы дэкларацыі — да 31 сакавіка.**



СТАР. 6

Камунальныя стасункі

## Супрацоўнічаць нельга змагацца

### Паразуменне падчас капрамонту: праз штрафы ці дамаўленне?

**Культура выканання работ падчас капрамонту ў Беларусі кульгае, а тэхналогія — парушаецца, сведчаць спецыялісты Дзяржбуднагляда. Доступ у кватэры і на балконы спецыялістам абмяжоўваецца жыхарамі, скардзяцца камунальнікі. Шляхі павышэння якасці капрамонту і наладжвання паразумення і зносін з уласнікамі жылля эксперты шукалі падчас «круглага стала» ў БелТА, абмяркоўваючы праблемы капітальнага рамонту ў краіне.** СТАР. 7



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

КОРАТКА

• **Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка накіраваў прывітанне ўдзельнікам, арганізатарам і гасцям рэспубліканскіх фінальных спаборніцтваў сярод дзяцей і падлеткаў па хакеі «Залатая шайба» на прызы Прэзідэнта Беларусі.**

• Прызёрамі адразу двух творчых рэспубліканскіх конкурсаў сталі курсанты Універсітэта МНС.

ISSN 1990 — 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Падпішыся на «Звязду» – і выйграй карысны прыз!

Ідзе падпіска на II квартал 2021 года

ВЯСНА І ЛЕТА — З ЛЮБІМАЙ ГАЗЕТАЙ!

З першых вуснаў

# «Я БОЛЬШ ЧЫМ ХТО-НЕБУДЗЬ ЗАЦІКАЎЛЕНЫ Ў ЗАХАВАННІ СУВЕРЭНІТЭТУ»

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка правёў нараду па пытаннях беларуска-расійскага супрацоўніцтва ў ваеннай сферы, на якой расказаў пра асноўныя тэмы перагавораў з расійскім калегам і пракаментаваў домыслы на гэту тэму ў СМІ.**

«Вельмі шмат пісалі пра гэту сустрэчу, на жаль, працэнтаў 70 — поўная лухта і выдумкі, я нават не збіраюся зараз пералічваць усе пытанні, якія былі абмеркаваныя, іх дзясяткі, вельмі многае было падвергнута рэвізіі, літаральна ўсе пытанні беларуска-расійскіх адносін. Але кантэкст гэтых перагавораў, калі можна так сказаць, абмежаваны быў рамкамі Саюзнай дзяржавы: першапачаткова — як ствараласяСаюзная дзяржава, пра што дамаўляліся, на якім узроўні знаходзімся зараз, і на што мы здольныя выйсці», — паведаміў кіраўнік дзяржавы.

У адказ на інсінуацыі ў СМІ Прэзідэнт падкрэсліў: ***«Мы суверэнныя і незалежныя дзяржавы.*** Сёння свет змяніўся настолькі, што размовы пра тое, што Беларусь павінна ўвайсці ў склад Расіі ці Расія павінна ўвайсці ў склад Беларусі, ці мы ўвогуле павінны неяк зліцца і стварыць адзіныя органы кіравання, — было б нават неразумна працаваць у гэтым кірунку».

Беларускі лідар упэўнены, што гэта і не патрэбна, бо як суверэнныя і незалежныя дзяржавы Беларусь і Расія могуць выбудаваць сістэму адносін, якая будзе больш моцная, чым узаемаадносіны асобных тэрыторый у самой Расійскай Федэрацыі. «І мы вельмі шмат зрабілі для гэтага, мы проста пра гэта не кажам. У нас жа людзі маюць роўныя магчымасці. Як бы ні было складана, суб'екты гаспадарання разумеюць на перагаворах адзін аднаго. Шмат дасягнулі», — аргументаваў Аляксандр Лукашэнка.

Непаразуменні ёсць, не стаў ён адмаўляць і прывёў прыклад аднаго з іх: «Калі ў Расіі сёлета падскочылі цэны на цукар, Уладзімір Уладзіміравіч (Пуцін. — **«Зв.»**) вельмі жорстка адрэагаваў на гэту тэму і папракнуў расійскіх вытворцаў цукру. Яны, аказваецца, у 2019 і 2020 гадах пераконвалі Прэзідэнта (Расійскай Федэрацыі. — **«Зв.»**), што беларусы запаланілі сваім цукрам Расію. Гэта ўвогуле немагчыма, але тым не менш. І што мяне ўразіла: Пуціна пераконвалі ў тым, што мы завозім трыснёг, перапрацоўваем яго, робім трысняговы цукар, самі яго ядзім, а Расіі пастаўляем бураковы цукар».

Гэта немагчыма, паўтарыў Прэзідэнт, бо ў Беларусі вытворчасць перабудаваная і мадэрнізаваная пад перапрацоўку буракоў, трыснёг, па яго словах, на перапрацоўку не імпартуецца ўжо гадоў 15. Але таваравытворцы Расійскай Федэрацыі дзеля нядобрасумленнай канкурэнцыі заводзяць у тупік цэлыя галіны эканомікі.

## «НАМ ТРЭБА ПРОСТА СПЛАНАВАЦЬ НАШЫ ДАЛЕЙШЫЯ ДЗЕЯННІ Ў ЭКАНОМІЦЫ»

«Мы хочам выбудаваць такія адносіны, каб не баяліся і не тузаліся з-за нейкіх санкцый, — звярнуў увагу кіраўнік дзяржавы. — Вось учора ўвялі санкцыі супраць Расіі, пазаўчора — супраць Беларусі, і ўжо гвалт нейкі. Навошта лямантаваць? ***Слухайце, 150 мільёнаў чалавек на такой тэрыторыі мы не можам накарміць? Проста. Таму вось у гэтым рэчышчы па ўсіх галінах мы падвяргалі аналізу сітуацыю. І прыходзілі да таго, што нам трэба пачынаць гэта рабіць. Нам трэба проста спланаваць, як робяць кітайцы, японцы, наколькі гэта магчыма, нашы далейшыя дзеянні ў эканоміцы».***

Вельмі сур'ёзнаму аналізу, па словах Прэзідэнта, была падвергнута беларуска-расійская кааперацыя ў прамысловасці і ваенна-прамысловым комплексе. Гаварылася аб тым, каб ажыццяўляць больш цесную кааперацыю. «Гэта нам выгадна», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Адзін з прыкладаў — завод «Інтэграл», які працуе і на грамадзянскі сектар і на абарончы. «У Расіі практычна няма такога прадпрыемства. Іх, па-мойму, было ў Савецкім Саюзе чатыры або пяць, усе знішчаныя, акрамя нашага «Інтэграла», — расказаў Прэзідэнт. — Давайце, кажу, будзем разам развіваць гэтае прадпрыемства. Тое, што яно зараз робіць: задавальняе патрэбы «абаронкі» нашай і расійскай, і грамадзянскага спажыўца. Давайце кааперавацца».

На саміце ў Сочы ішла размова і пра шчыльную кааперацыю з беларускімі рамонтнымі заводамі для ваеннай тэхнікі ў Баранавічах, у Барысаве, у Оршы. «Прэзідэнт Расіі сказаў: нам гэта вельмі цікава. Таму ў гэтым кірунку і ўраду, і дзяржсакратарыяту, і Міністэрству абароны трэба больш актыўна сябе паводзіць», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

## «НАС БУДУЦЬ ПАСТАЯННА ТУЗАЦЬ, І МЫ ПАВІННЫ АДКАЗВАЦЬ»

Была абмеркаваная ў Сочы і ўвогуле тэма абароны.

«Мы ж бачым, што адбываецца. Два тыдні таму самалёты НАТА літаральна на мяжу нашу выляталі, — адзначыў Прэзідэнт. — Што мы вымушаны былі зрабіць? Мы паднялі новы самалёт Су-30 і насустрач падляцелі да іх — змыліся за сотні кіламетраў. Гэта кажа пра тое, што ***нас будуць пастаянна тузаць, і мы павінны адказваць***».

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, як падчас чэмпіянату свету па хакеі ў Мінску расійскія ваенныя самалёты ажыццяўлялі дзяжурства на тэрыторыі Беларусі, а абслугоўвалі іх разам з расіянамі беларускія лётчыкі. У Сочы, па словах беларускага лідара, ішла размова аб працягу падобнай практыкі. Пры гэтым не трэба ствараць новыя ваенныя базы, упэўнены Прэзідэнт.

«Вядома, калі яны (расійскія ваенныя самалёты. — **«Зв.»**) змогуць базіравацца на нашых базах, і нашы хлопцы будуць лятаць разам з расіянамі, ну натуральна, трэба прасіць тады і зброю да гэтых самалётаў, да таго ж, самая сучасная зброя павінна быць. Мы не кажам пра ядзерныя боегалоўкі, мы кажам пра звычайную зброю, — дадаў беларускі лідар. — Вось гэтая тэматыка, гэты блок быў, напэўна, самы шырокі ў нашых перагаворах».

У сферы абароны Беларусь і Расія працягнуць работу ў рамках саюзнай групоўкі і сумеснай супрацьпаветранай абароны, адзначыў Прэзідэнт.

«Гэта святое. Для сучаснай вайны (не дай божа) гэта галоўнае. Але ***мы павінны выбудаваць так сістэму, каб нашы хлопцы змаглі навучыцца самым перадавым методыкам вядзення вайны, абароны і гэтак далей. Бранятэхніку, аўтамабільную справу, самалёты мы павінны асвойваць разам з Расійскай Федэрацыяй.*** Вось гэты кірунак Прэзідэнтам Расіі быў з натхненнем падтрыманы», — рэзюмаваў Аляксандр Лукашэнка.

## «НІХТО НЕ ПРАСІЎ ДАДАТКОВЫХ КРЭДЫТАЎ»

Кіраўнік дзяржавы пракаментаваў выказванні ў СМІ наконт быццам бы просьбы аб чарговым расійскім крэдыце для Беларусі. Размова, па яго словах, насамрэч пра значную эканомію падчас будаўніцтва БелАЭС, якое ажыццяўляецца пад расійскі крэдыт (што з'яўляецца сусветнай практыкай) і пра ранейшую дамоўленасць аб пакіданні азначанага крэдыту на іншыя патрэбы ў выпадку такой эканоміі.

***«Ніхто не прасіў дадатковых крэдытаў. Нам гэта не патрэбна»,*** — заявіў Прэзідэнт.

На перагаворах ішла размова пра будаўніцтва новага азотнага комплексу ў Гродне. «Попыт на азотныя ўгнаенні ў свеце вельмі добры, мы будзем ствараць і комплексныя, і змешаныя ўгнаенні. Нам патрэбны азот. Фосфар ёсць, калій ёсць, азот у нас ёсць, але мы хочам павялічыць вытворчасць азоту з прыроднага газу. Калі «Газпраму» цікава, мы можам дамовіцца пра будаўніцтва з імі. Ні пра якія грошы размовы на гэтых перагаворах не было. ***Таму калі нас хочуць папракнуць у нечым, што мы зноў з працягнутай рукой — лухта поўная,*** — запэўніў беларускі лідар. — ***Мы пакуль абыходзімся, дзякаваць богу, пры ўсіх складанасцях з пандэміямі і закрыццём межаў, сваімі грашовымі сродкамі».***

Асобна ў Сочы ішла размова пра падатковыя сістэмы Беларусі і Расіі, паведаміў Прэзідэнт. «Мы дамовіліся, што яшчэ раз вернемся на ўзроўні беларуска-расійскіх перагавораў спецыялістаў, — сказаў ён. — Паглядзім яшчэ раз наваці расійскія, калі гэта сапраўды наваці, мы гэта прымем».

Гэта датычыцца ўсіх дарожных картаў двухбаковай інтэграцыі, дадаў Аляксандр Лукашэнка. «Галоўнае, каб гэта было празрыста і для Беларусі, і для Расіі, каб не было недагаворвання, не выклікала падазрэнняў», — удакладніў ён.

## «НЕ ПРОЦІБОРСТВА, А ВАЙНА»

У Сочы была абмеркаваная і грамадска-палітычная сітуацыя ў нашых краінах, дадаў Прэзідэнт.

***«Мы разумеем, што нас будуць справакаваць ужо не на зуб, а на ўсе зубы,*** — сказаў ён удзельнікам нарады. — Мы абмяняліся закрытай інфармацыяй, сакрэтнымі дакументамі, якія наш Камітэт дзяржбяспекі, ГРУ Генштаба здабываюць. Адкрыта мяне пазнаёміў Прэзідэнт (Пуцін. — **«Зв.»**) са многімі матэрыяламі. У прыватнасці, нашы збеглыя, як я заўважыў гэта з матэрыялаў, ды і нашы гэта бачаць разведчыкі, зараз спрабуюць знайсці палац Лукашэнкі, як «знайшлі» палац Пуціна. Вось гэта ў іх зараз самае галоўнае. Укінуць у медыйную прастору больш паскудства, каб у гэты касцёр падкідваць дровы хоць бы да красавіка. Разумееце? Ім трэба завесці народ Беларусі, разварушыць, каб, як яны кажуць, цытую: «не спала хваля актыўнасці». Таму яны будуць укідваць любыя «фэйкі». Мы да гэтага гатовыя».

Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што гатовы паказаць любое сваё асабістае памяшканне, калі гэта некаму цікава. ***«Яшчэ раз хачу і вам сказаць, і ўсім, хто мяне слухае: Лукашэнка за чвэрць стагоддзя нічога ў дзяржавы не скраў,*** — запэўніў ён. — І ніякіх палацаў. У Александрыі ў мяне «палац» — сем на восем метраў, дзе мы з маці жылі, — вось гэты палац. Калі ласка, ён адкрыты, каб паглядзелі, дзе жыў першы Прэзідэнт Беларусі».

Шмат у медыяпрасторы размоў і пра трансфер улады ў Беларусі, працягнуў Прэзідэнт. ***«Ніякага трансферу быць у Беларусі не можа. Я ўжо казаў. Ніякія дзеці, унукі і праўнукі не могуць пасля Прэзідэнта Лукашэнкі прэтэндаваць на гэту пасаду. Усё будзе па Канстытуцыі і законе. Канстытуцыю мы прымем, як я і казаў, у студзені-лютым наступнага года, вось і ўвесь трансфер улады»,*** — рэзюмаваў ён, дадаўшы, што падобныя размовы былі б нават непрыстойныя для расійскага кіраўніцтва, бо гэта выключная справа Беларусі, падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

## «РАСІЯ — ГЭТА НЕПАХІСНА АСНОЎНЫ НАПРАМАК»

У адрозненне ад унутраных спраў кожнай з краін, знешнюю палітыку Беларусь і Расія працягнуць каардынаваць разам, заявіў Аляксандр Лукашэнка. ***«Нашы абаронныя і знешнепалітычныя ведамствы з'яўляюцца ўзорам для супрацоўніцтва іншым, тут поўнае ўзаемаразуменне,*** — сказаў ён. — І мы поўныя рашучасці стварыць такое аб'яднанне ў Саюзнай дзяржаве, што камар носа не падточыць. Ніхто нас не папракне, што нехта замахнуўся на нечую незалежнасць, суверэнітэт і гэтак далей. Усё будзе прыгожа і прыстойна».

У гэтай сувязі Аляксандр Лукашэнка спыніўся на тэме шматвектарнай знешняй палітыкі Беларусі, у чым чарговы раз нашу краіну папракаюць расійскія палітыкі: «Яшчэ раз паўтараю: ***наша шматвектарнасць абумоўлена перш за ўсё нашай эканамічнай палітыкай.*** Калі Расійская Федэрацыя сёння гатова ўвесь беларускі экспарт спажываць, тады і вектар будзе ў тым напрамку. Але Расія не гатовая».

Палітычную шматвектарнасць абумоўлівае і суседства Беларусі з ЕС. Да таго ж супрацоўніцтва з высокатэхналагічным, багатым Захадам выгаднае любой краіне, канстатаваў Прэзіэнт. ***«Пры гэтым мы кажам, што Расія — гэта непахісна асноўны напрамак, па якім мы гатовыя рухацца»,*** — дадаў ён.

«У нас ёсць цвёрдае разуменне, што гэта наша агульная Айчына — ад Брэста да Уладзівастока, дзе сёння існуюць дзве незалежныя дзяржавы, — абазначыў становішча спраў Аляксандр Лукашэнка. — Яшчэ раз хачу падкрэсліць: ***як бы ні складвалася сітуацыя ў Беларусі, я як першы Прэзідэнт Беларусі больш чым хто-небудзь з нашых грамадзян зацікаўлены ў захаванні суверэнітэту нашай дзяржавы.*** Інакш можна перакрэсліць усю чвэрць стагоддзя, якую мне прыйшлося працаваць Прэзідэнтам».

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

---

Ва ўрадзе

# ПЕРААСЭНСАВАННЕ ДЫРЭКТЫЎ

### На чарговым пасяджэнні Прэзідыума Савета Міністраў абмеркавалі праблемныя пытанні развіцця будаўнічай галіны і ЖКГ

**Аб рэалізацыі Дырэктывы Прэзідэнта № 7 «Аб удасканаленні і развіцці жыллёва-камунальнай гаспадаркі краіны» і Дырэктывы № 8 «Аб прыярытэтных кірунках развіцця будаўнічай галіны» расказалі адпаведныя міністры Андрэй Хмель і Руслан Пархамовіч.**

Ва ўступным слове **прэм'ер-міністр Беларусі Раман ГАЛОЎЧАНКА** адзначыў, што гэтыя галіны маюць немалаважнае значэнне для сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны і вызначаюць стаўленне насельніцтва да ўлады.



Фота БелТА.

«Нягледзячы на пэўную станоўчую дынаміку, шэраг патрабаванняў дырэктыў і іншых дакументаў, якія садзейнічаюць іх рэалізацыі, выконваецца на недастатковым узроўні. Гэта датычыцца капітальнага рамонту жылога фонду, замены цеплавых сетак, арганізацыі работы па комплекснай індывідуальнай жылёвай забудове, будаўніцтву арэнднага жылля. Не прымаюцца дастатковыя меры па павышэнні эфектыўнасці абыходжання з цвёрдымі камунальнымі адходамі і другаснымі матэрыяльнымі рэсурсамі», — сказаў Раман Галоўчанка.

Па яго словах, не забяспечваецца таксама поўны разлік з арганізацыямі ЖКГ, што пагаршае іх фінансавы стан. У будаўнічтве захоўваецца, як дадаў прэм'ер, наяўнасць стратных прадпрыемстваў і высокі ўзровень запазычанасці перад падраднымі арганізацыямі.

«Вынікі мінулага года сведчаць аб недастатковай паспяховасці работы на знешніх рынках, што выяўляецца ў зніжэнні экспарту тавараў і паслуг у будаўніцтве. Недастатковымі тэмпамі вядзецца работа па ўдасканаленні заканадаўства, якое рэгулюе ўзаемадзеянне ўдзельнікаў будаўнічага працэсу, хоць зроблена ў гэтым кірункуletась нямала», — падкрэсліў Раман Галоўчанка.

Вялікую заклапочанасць у яго выклікаюць значныя аб'ёмы звышнарматыўнага незавершанага будаўніцтва і капітальнага рамонту жыллёвага фонду — у сталіцы да гэтага дадаюцца зрывы тэрмінаў уводу ў эксплуатацыю шматкватэрных дамоў.

«Нягледзячы на нарматыўнае ўрэгуляванне пытання будаўніцтва жылля для чарговікоў сталіцы ў гарадах-спадарожніках, работа, якая праводзіцца ў гэтым кірунку гарадскім выканаўчым камітэтам, не з'яўляецца дастатковай. Такі стан спраў патрабуе крытычнага пераасэнсавання, прыняцця мер на ўзроўні выканаўцаў», — канстатуе кіраўнік Саўміна.

**Марыя ДАДАЛКА.**

З нагоды

# СУПРАЦОЎНІКІ ОРГАНАЎ УНУТРАНЫХ СПРАЎ ГОДНА ВЫКОНВАЮЦЬ ПАСТАЎЛЕНЫЯ ЗАДАЧЫ

Такое меркаванне выказаў **кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар СЕРГЕЕНКА** падчас візіту ў Акадэмію МУС, паведаміла БелТА.



Фота БелТА.

«Гэтая сустрэча праходзіць напярэдадні прафесійнага свята — Дня міліцыі. Сёння ў Акадэміі МУС навучанне вядзецца на высокім тэхнічным узроўні. Сур'ёзным прагрэсам з'яўляецца тое, што ў гэтым працэсе актыўна задзейнічаны афіцэры-практыкі, выкарыстоўваецца патэнцыял ветэранаў МУС, арганізавана ўзаемадзеянне з падраздзяленнямі цэнтральнага апарату МУС і абласнымі ўпраўленнямі, адкуль паступаюць архіўныя матэрыялы, для таго каб выкарыстоўваць іх у навучанні моладзі. У наяўнасці — спалучэнне тэорыі і практыкі, — адзначыў Ігар Сяргеенка. — Цяпер для ВНУ актуальныя новыя задачы і кірункі: пытанні інфармацыйнага процідзеяння, камп'ютарнай разведкі, шэраг іншых кірункаў, якія звязаныя з развіццём менавіта тэхнікі. Я хацеў бы адзначыць, што ў акадэміі гэтаму аддаецца самая сур'ёзная ўвага, таму што за гэтым будучыня».

Паводле яго слоў, нараўне з навучальным і навуковым працэсамі важная падрыхтоўка патрыятычных, адданых краіне маладых афіцэраў. «Конкурс досыць высокі, хлопцы ідуць у Акадэмію МУС з цікавасцю і жаданнем вучыцца, атрымліваюць тут дастаткова высокую падрыхтоўку, якая запатрабавана не толькі ў сістэме МУС, але і ў іншых структурах сілавога блока Беларусі. Сёння вельмі важна мець уласную нацыянальную кузню кадраў, якая рыхтуе высокаадукаваных грамадзян, годных афіцэраў. І падзеі лета і восені мінулага года паказалі, што супрацоўнікі органаў унутраных спраў годна выконвалі пастаўленыя задачы, спынялі масавыя беспарадкі, рэагавалі, прыходзілі на дапамогу людзям. Наш народ сапраўды ўбачыў абаронцаў нашай краіны, абаронцаў інтарэсаў простых людзей у асобе супрацоўнікаў міліцыі», — падкрэсліў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта.

У сваю чаргу, **першы намеснік начальніка Акадэміі МУС Аляксей БАШАН** адзначыў, што навучанне ў акадэміі асабліва прывабнае дзякуючы магчымасці атрымання тэарэтычных ведаў без адрыву ад практыкі. «З 2019 года мы сталі рыхтаваць спецыялістаў па супрацьдзеянні кіберзлачынствам, першы выпуск якіх адбыўся летась. Варта адзначыць, што Міністэрства ўнутраных спраў рыхтуе для сябе кадры з нашай дапамогай — гэта значыць, што з намі дзеляцца эфектыўнымі і перадавымі напрацоўкамі, распавядаючы пра выклікі і пагрозы, а таксама пра тое, на што неабходна звяртаць увагу. Веды выпускніка павінны быць актуальныя тут і цяпер. Самая галоўная якасць, якая ў іх павінна быць, — неабыякавасць, гатоўнасць служыць, прыносіць карысць дзяржаве. Міліцыянер — гэта чалавек, які служыць 24 гадзіны ў суткі сем дзён на тыдзень, і ён павінен быць гатовы да самаахвяравання ў добрым сэнсе гэтага слова», — лічыць Аляксей Башан.

### Дарэчы

Акадэмія МУС заснавана ў 1958 годзе як Мінскае аддзяленне факультэта завочнага навучання Вышэйшай школы МУС СССР. Падрыхтоўка кадраў ажыццяўляецца ў інтарэсах Міністэрства ўнутраных спраў, Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз, Следчага камітэта, Дзяржаўнага пагранічнага камітэта, Дэпартамента фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржаўнага кантролю, Міністэрства абароны. За больш чым паўвекавую гісторыю ў сценах установы падрыхтавана звыш 36 тысяч спецыялістаў. Акадэміяй МУС заключана 67 міжнародных дагавораў і пагадненняў аб супрацоўніцтве ў галіне адукацыі і навукі з замежнымі ВНУ і арганізацыямі.

Блізкая ўлада

# АД ПРЫВАТНАГА ДА АГУЛЬНАГА

**На гэтым тыдні прадстаўнікі Адміністрацыі Прэзідэнта праводзяць сустрэчы з працоўнымі калектывамі і асабістыя прыёмы работнікаў прадпрыемстваў. Якія пытанні ўзнімаюць людзі падчас гэтых прыёмаў?**

Памочнік Прэзідэнта — інспектар па Магілёўскай вобласці Леанід Мартынюк сустракаўся з работнікамі ААТ «Ольса» ў Магілёве. Большая частка пытанняў датычылася бытавых праблем. У прыватнасці, праблемы транспартных зносін закранула супрацоўніца ААТ «Ольса» Алена Пруднікава. Жанчына падзялілася яшчэ адной праблемай: адсутнасць дзіцячых пляцовак у іх раёне. Вольга Іганава звярнулася на асабісты прыём з пытаннем аб магчымай прыватызацыі жылога блока ў інтэрнаце. Леанід Мартынюк даручыў дэталёва распрацаваць па кожным звароце.

Акрамя правядзення асабістага прыёму грамадзян, Леанід Мартынюк азнаёміўся з работай прадпрыемства. У адным з цэхаў ён сустрэўся з работнікамі завода — тут адбылося абмеркаванне вынікаў VI Усебеларускага народнага сходу. «Любыя зносіны даюць станоўчы вынік. Сённяшняя сустрэча з калектывам паказала, што людзі інфармаваныя. Яны ведаюць, пра што гаварылі на УНС, які мы абмяркоўвалі. Яны ўжо зрабілі свае высновы, ацанілі пасылы форуму, — адзначыў Леанід Мартынюк. — Безумоўна, задача ўлады, чыноўніка любога рангу — выслухаць людзей. І калі ёсць якая-небудзь праблема, то прыняць рашэнне і пастарацца зрабіць людзям камфортнейшае жыццё».

А памочнік Прэзідэнта — інспектар па горадзе Мінску Аляксандр Барсукоў правёў асабісты прыём грамадзян у ТАА «Мотавелазавод». Гучалі пытанні паляпшэння жыллёвых умоў сем'яў, прыборкі пад'ездаў, работы ўстаноў аховы здароўя, развіцця веларуху ў краіне.

Кладаўшчык 4-га разраду Ірына Радзюк пацікавілася, чаму шматдзетнай сям'і яе сына не даюць магчымасці выкарыстоўваць сямейны капітал (на трэцяе дзіця) на куплю жылля на другасным рынку. А гэта для сына адзіная магчымасць: у чарзе маючых патрэбу сям'я не знаходзіцца, паколькі сукупнай плошчы ў Мінску ў блізкіх сваякоў хапае. Аляксандр Барсукоў прапанаваў варыянт пастаноўкі ў чаргу маючых патрэбу: «Калі на законных падставах можна будзе нешта зрабіць, паспрабуем».

Выконваючы абавязкі начальніка аддзела рознічнага гандлю завода Яўген Карабейнік пацікавіўся, якія перспектывы для веларуху ў краіне. На яго думку, патрэбна нацыянальная праграма развіцця веласіпеднай інфраструктуры, неабходна дакладная і адзіная рэгламентацыя, як, дзе і што рабіць. Ён перадаў падрыхтаваную прэзентацыю з прапановамі для вывучэння. Яго кандыдатуру прапануюць для ўключэння ў Савет па развіцці веларуху пры Міністэрстве спорту і турызму.

Памочнік Прэзідэнта не першы раз наведвае гэтае прадпрыемства. Аляксандр Барсукоў пасля прыёму запэўніў, што па кожным звароце будуць прыняты меры, ні адзін не застанецца па-за ўвагай. Але ёсць і тэмы, якія можна вырашыць толькі на ўзроўні кіраўніка дзяржавы, усе яны гучалі на нарадзе ў Прэзідэнта. Неабходна падтрымаць брэнд мотавелазавода, для гэтага патрэбныя не толькі рэклама і менеджмент, але і ўдасканаленне якасці прадукцыі і цэнаўтварэння. Аднак перш за ўсё трэба будзе вырашыць пытанне больш эфектыўнага выкарыстання пустых плошчаў завода. «Мы дапрацоўваем некаторыя моманты, якія датычацца развіцця гэтага прадпрыемства, і будзем прапаноўваць кіраўніку дзяржавы нейкія рашэнні», — сказаў на заканчэнне Аляксандр Барсукоў.

**Паводле БелТА.**

*На гэтым тыдні работа супрацоўнікаў Адміністрацыі Прэзідэнта на прадпрыемствах працягнецца. 4 сакавіка намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Дзмітрый Мікалаевіч КРУТОЙ правядзе сустрэчу і асабістыя прыём грамадзян на ААТ «Гомсельмаш» у Гомелі; памочнік Прэзідэнта — інспектар па Брэсцкай вобласці Валерый Паўлавіч ВАКУЛЬЧЫК — на ААТ «Івацэвічдрэў» у горадзе Івацэвічы, а памочнік Прэзідэнта — інспектар па Магілёўскай вобласці Леанід Аляксеевіч МАРТЫНЮК — у філіяле «Ялізава» ААТ «Гродзенскі шклозавод» у Асіповіцкім раёне.*

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### У Італіі максімальны эканамічны спад



Эканоміка Італіі ў 2020 годзе перажыла найвялікшы спад з часоў Другой сусветнай вайны, абваліўшыся на 8,9 працэнта. Аб гэтым сведчаць канчатковыя даныя статыстычнага агенцтва ISTAT. Аб'ём эканомікі апусціўся ніжэй за 1,6 трыльёна еўра, што з'яўляецца самым нізкім значэннем з 1997 года, паведаміла ANSA. Тым не менш падзенне апынулася крыху меншае за прагноз урада краіны, які чакаў спаду на 9 працэнтаў. Дэфіцыт бюджэту летась склаў 155,6 мільярда еўра — 9,5 працэнта ВУП. Гэта максімальнае адмоўнае сальда, па меншай меры, з 1995-га. Рост дэфіцыту абумоўлены выдаткамі на падтрымку бізнесу і насельніцтва, якія пацярпелі ад пандэміі каранавіруса. Дзярждоўг у мінулым годзе вырас да 155,6 працэнта ВУП у параўнанні з 134,6 % у 2019-м.

### У СААЗ палічылі нерэалістычнымі прагнозы аб перамозе над ковідам да канца года

Сцвярджаць, што пандэмію ўдасца спыніць да канца гэтага года, заўчасна і нерэалістычна. Аб гэтым заявіў дырэктар праграмы Сусветнай арганізацыі аховы здароўя (СААЗ) па надзвычайных сітуацыях Майкл Раян. У той жа час, паводле яго слоў, з'яўленне ў свеце эфектыўных вакцын супраць COVID-19 можа скараціць колькасць цяжкіх выпадкаў захворвання, выкліканых інфекцыяй, і смяротных зыходаў. «Калі мы будзем разумныя, то зможам скончыць са шпіталізацыяй, смярцямі і трагедыямі, звязанымі з пандэміяй», — сказаў Майкл Раян на брыфінгу. Тым не менш, па даных СААЗ, колькасць новых выпадкаў заражэння каранавірусам ва ўсім свеце вырасла на мінулым тыдні ўпершыню за апошнія паўтара месяца. Генеральны дырэктар СААЗ Тэдрас Гебрэесус заявіў, што рост колькасці выпадкаў захворвання «расчароўвае, але не здзіўляе», і заклікаў краіны не аслабляць меры па прадухіленні распаўсюджвання інфекцыі.

### Анджаліна Джалі прадала пейзаж Чэрчыля за рэкордную цану

Адзіная карціна, якую колішні брытанскі лідар Уінстан Чэрчыль напісаў падчас Другой сусветнай вайны, была прададзена на аўкцыёне Christie's у Лондане за рэкордныя для яго работ 11,5 мільёна долараў, паведаміла CNN. Да таргоў палатно належала сям'і актрысы Анджаліны Джалі. У 2011 годзе акцёр Брэд Піт падарыў ёй унікальную карціну, паведаміла CNN са спасылкай на крыніцу, блізкую да таргоў. Гэта пейзаж 1943 года «Мінарэт мячэці Кутуб», на якім намалёваны захад сонца ў Маракешы, адзін з упадабаных сюжэтаў Чэрчыля. Эстымейт палатна склаў $2-3,4 млн. Папярэдні рэкорд для карцін Чэрчыля на таргах быў устаноўлены ў 2014 годзе ў аўкцыённым доме Sotheby's — $2,7 млн.

Кніжная навінка

У БДУ выйшаў першы ў Беларусі «Кітайска-беларускі слоўнік. Беларуска-кітайскі слоўнік»

# Склады піньінь і іх транскрыпцыя

**У склад аўтарскага калектыву ўвайшлі супрацоўнікі Рэспубліканскага інстытута кітаязнаўства імя Канфуцыя БДУ і Інстытута мовазнаўства Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Навуковым кіраўніком і ініцыятарам праекта выступіў дырэктар Рэспубліканскага інстытута кітаязнаўства імя Канфуцыя Анатоль ТОЗІК.**

Работа над слоўнікам вялася на працягу двух гадоў. Гэта першая лексікаграфічная праца ў гісторыі культурна-моўных сувязяў беларускага і кітайскага народаў. Арыгінальнае выданне аб'ёмам 872 старонкі ўключае больш за 18 тысяч слоў. У слоўніку прадстаўлена актуальная лексіка беларускай і кітайскай моў. Акрамя таго, аўтарскім калектывам выдання распрацавана табліца «Склады піньінь і іх беларуская транскрыпцыя».

Слоўнік адрасаваны ў першую чаргу тым, хто вывучае кітайскую мову ў Беларусі і беларускую мову — у Кітаі, а таксама беларускім і кітайскім перакладчыкам, лінгвістам, культуролагам.

Выданне будзе накіравана ў 14 цэнтраў па вывучэнні Беларусі, беларускай культуры і мовы, створаных у кітайскіх універсітэтах і навуковых установах. У іх ліку Даляньскі політэхнічны ўніверсітэт, Шанхайскі педагагічны ўніверсітэт, Другі Пекінскі ўніверсітэт замежных моў і іншыя. Таксама слоўнік перададуць у бібліятэкі ВНУ і школ нашай краіны, дзе выкладаецца кітайская мова.

Плануецца, што ў сакавіку выданне паступіць і ў продаж. Яго можна будзе набыць у краме кітайскай кнігі ў Інстытуце кітаязнаўства па вуліцы Рэвалюцыйнай, 11.

Адначасова з выхадам слоўніка выдадзены падручнік беларускай мовы для кітайскіх студэнтаў.

Кітайскую мову як замежную пачалі выкладаць у школах Беларусі ў 2006 годзе, яшчэ раней — у МДЛУ (у 1993 годзе) і ў БДУ (у 2001 годзе). Сёння ў якасці асноўнай мовы і факультатыўна яе вывучаюць у 130 школах і 10 універсітэтах нашай краіны.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Даслоўна

# Надзейны парадак і стабільнасць

**Напярэдадні Дня міліцыі з прафесійным святам беларускіх праваахоўнікаў павіншаваў міністр унутраных спраў Іван КУБРАКОЎ, паведамілі ў прэс-службе ведамства.**

— Ужо больш за стагоддзе беларуская міліцыя з'яўляецца надзейнай апорай дзяржавы і абаронай для народа, заўсёды знаходзячыся на перадавой барацьбы з крымінальнымі праявамі. Сёння наша краіна перажывае складаны этап развіцця, звязаны з абаронай суверэнітэту і барацьбой з наступствамі пандэміі каранавіруса. Калейдаскоп падзей 2020 года стаў экзаменам для людзей у форме, — сказана ў віншаванні.

Іван Кубракоў адзначыў, што супрацоўнікі і вайскоўцы сістэмы МУС словам і справай даказалі вернасць прысязе, народу і дзяржаве:

— У тым, што Беларусь не паўтарыла сумнага лёсу некаторых краін, немалая заслуга нашага ведамства. Мы з вамі забяспечылі парадак і стабільнасць на вуліцах, не дапусцілі грамадзянскага расколу і самавольства з боку радыкальных элементаў, — сказаў Іван Кубракоў.



Міністр унутраных спраў выказаў словы падзякі родным і блізкім міліцыянераў і вайскоўцаў:

— Цяплом сваіх сэрцаў вы ў патрэбны момант падтрымалі сваіх мужоў, сыноў, бацькоў, братоў, забяспечыўшы надзейны тыл. Для ўсіх нас вельмі важныя вашы ўдзел і ўвага, а таксама непахісная вера ў перамогу дабра над злом.

Кіраўнік ведамства адзначыў і непарушнасць сувязі ветэранаў праваахоўных органаў, і тых, хто нясе службу сёння:

— Яны плячо ў плячо з дзеючымі супрацоўнікамі міліцыі выступілі супраць спроб развалу краіны. Іх узважаная і мудрая пазіцыя ў гэтай сітуацыі вартая павагі і служыць прыкладам.

Іван Кубракоў пажадаў шчасця, здароўя, міру і дабрабыту ў сем'ях. А разам з тым і далей прафесійна і плённа працаваць на карысць Айчыне, гарантуючы бяспеку людзей і іх спакойнае жыццё.

Супрацоўніцтва

# УЗОРНАЯ МАДЭЛЬ

**Беларусь з'яўляецца прыкладам стварэння дзейснай нацыянальнай сістэмы выдзялення прытулку і работы з бежанцамі. Гэта адзначыў прадстаўнік Упраўлення Вярхоўнага камісара ААН па справах бежанцаў у Рэспубліцы Беларусь Жан Іў Бушардзі падчас рабочай сустрэчы з першым намеснікам міністра ўнутраных спраў Юрыем НАЗАРАНКАМ, паведамляе прэс-служба МУС.**

Візіт адбыўся напярэдадні завяршэння місіі высокага госця ў Беларусі. За восем гадоў сумеснай работы быў зроблены вялікі ўнёсак у развіццё ўсебаковага ўзаемадзеяння і дружалюбных адносін паміж МУС Беларусі і Прадстаўніцтвам УВКБ ААН. Гэта адзначыў Юрый Назаранка:



— Шэраг дасягненняў мае важнае стратэгічнае значэнне, як для нашай краіны, так і для УВКБ ААН. Мы высока цэнім тое, з якой энергіяй вы аказвалі садзейнічанне ў прасоўванні на пляцоўках міжнародных арганізацый беларускіх ініцыятыў, усяляк спрыялі прыцягненню донарскага фінансавання для рэалізацыі шэрагу прынцыпова важных для нашай дзяржавы праектаў, накіраваных на падтрымку нацыянальных намаганняў у сферы садзейнічання ўпарадкаванай, бяспечнай, законнай і адказнай міграцыі.

У сваю чаргу, Жан Іў Бушардзі выказаў упэўненасць у тым, што беларуская мадэль стане арыенцірам для многіх дзяржаў рэгіёна:

— Без шматгадовага эфектыўнага і канструктыўнага ўзаемадзеяння на ўсіх узроўнях немагчыма было б дасягнуць такіх вынікаў.

У знак павагі і за плённае супрацоўніцтва Юрый Назаранка ўручыў Жану Іву Бушардзі ад імя міністра ўнутраных спраў Беларусі нагрудны знак «За адзнаку».

# «Трэба шанаваць мір і спакой на вуліцах нашых гарадоў»

**У Магілёўскім інстытуце МУС адбылася сустрэча курсантаў з міністрам унутраных спраў Іванам КУБРАКОВЫМ. Падчас сустрэчы абмяркоўваліся ключавыя аспекты VI Усебеларускага народнага сходу, сітуацыя ў краіне і свеце, удзяляліся пытанні інфармацыйнай бяспекі, патрыятызму, паведаміла БелТА.**

Гэта быў першы візіт кіраўніка ведамства ў навучальную ўстанову. Ён азнаёміўся з матэрыяльна-тэхнічнай базай, умовамі навучання і быту курсантаў, пагутарыў з выкладчыкамі. А таксама адказаў на шматлікія пытанні. Яны мелі шырокі спектр — ад грамадска-палітычнай сітуацыі ў краіне і задач, якія стаяць перад органамі ўнутраных спраў, да літаратурных і кінематаграфічных пераваг самога міністра.

«Трэба шанаваць мір і спакой на вуліцах нашых гарадоў, — падкрэсліў Іван Кубракоў. — Падзеі жніўня—кастрычніка мінулага года паказалі, што такое добра і што такое дрэнна, сталі своеасаблівай лакмусавай паперкай і праверкай на трываласць для нашых супрацоўнікаў. І яны не спалохаліся, з гонарам выканаўшы пастаўленую задачу».

Міністр падкрэсліў, што разам з міліцыянерамі служаць іх сем'і. І калі з боку блізкіх ёсць падтрымка і разуменне — нецаэнна. Іван Кубракоў заклікаў маладых калег паважаць традыцыі, закладзеныя папярэднімі пакаленнямі вартавых парадку, працягваць іх справу, шанаваць сяброўства, чалавечыя адносіны, клапаціцца аб уласным здароўі. «Каб быць гатовым супрацьстаяць усім выклікам і пагрозам, трэба ў тым ліку падтрымліваць добрыя фізічныя кандыцыі», — адзначыў ён.



Фота Магілёўскага інстытута МУС.

«Мне пашчасціла стаць удзельнікам усенароднага веча, на якім абмеркавалі асноўныя аспекты жыцця нашага грамадства, намецілі планы на найбліжэйшую будучыню. 2020 год паказаў, што мірнае і спакойнае жыццё — самае важнае для ўсіх нас. Працаваць, гадаваць дзяцей, не баяцца за родных і блізкіх, за сваю маёмасць — нармальны стан для любога чалавека. І органы ўнутраных спраў адыгрываюць ключавую ролю ў забеспячэнні грамадскага парадку, з'яўляюцца гарантам бяспекі. Усё гэта я пастараўся расказаць курсантам. Вядома, пагаварылі мы і па нашых унутраных пытаннях, пра асаблівасці навучання будучых міліцыянераў. Я пастараўся максімальна поўна адказаць на іх пытанні, з цікавасцю выслухаў усе прапановы», — расказаў міністр журналістам.

Іван Кубракоў павіншаваў курсантаў з надыходзячым прафесійным святам, пажадаў ім стаць сапраўднымі прафесіяналамі і шчыра любіць абраную прафесію.

Напярэдадні

# ВАЛЬС І РУКАПАШНЫ БОЙ

**Да Дня міліцыі ў Палацы Рэспублікі запланаваны святочны канцэрт. Шэраг нумароў у ім прэзентуюць навучэнцы Акадэміі Міністэрства ўнутраных спраў. Пра тое, як кузня маладых міліцэйскіх кадраў рыхтуецца да свята, «Звяздзе» расказаў начальнік цэнтра культурна-выхаваўчай работы падпалкоўнік міліцыі Юрый ГУЛЯКА.**



Фота дадзена Акадэміяй МУС.

— Калі да нас паступаюць першакурснікі, мы імкнёмся абудзіць у іх творчы пачатак і яго разнапланава развіць. Справа ў тым, што вельмі мала прыходзяць абітурыентаў, якія маюць адпаведную адукацыю. Таму мы робім стаўку на самадзейнасць і, трэба сказаць, атрымліваецца вельмі нядрэнна. Напрыклад, падрыхтоўка да Дня міліцыі пачынаецца адразу ж пасля папярэдняга свята і доўжыцца каля года. Напрацоўваецца новы рэпертуар, а часам у гэтых сценах нараджаюцца і новыя песні. У гэтым нам дапамагаюць прафесійныя балетмайстры, харэографы, сцэнографы. Нашы курсанты вучацца рухацца на сцэне і мінімальнаму набору танцаў — вальсу, мазурцы, менуэту. Гэтыя навыкі дапамогуць ім не толькі падчас выступлення. Напрыклад, яны змогуць быць вядучымі на мерапрыемствах у сваёй альма-матар, — заўважыў Юрый Гуляка.

Акрамя творчых здабыткаў, курсанты Акадэміі МУС прадэманструюць і прафесійныя навыкі. Напрыклад, зараз да выступлення рыхтуецца група рукапашнага бою. Мяркуецца, што яна пакажа тры нумары.

— Сёлета праграма будзе крыху адрознівацца ад мінулагодняй, але менавіта як, пакуль застанецца сакрэтам. Магу сказаць толькі адно: будзе вельмі відовішча. Але мы стараемся не паўтарацца, — адзначыў Юрый Гуляка.

Напрыклад, у мінулыя гады гледачы канцэрта маглі ўбачыць нумары са спецтэхнікай. Аўтамабілі падымаліся на сцэну на спецыяльных пандусных ліфтах. Байцы спецыяльных падраздзяленняў пры дапамозе адмысловых прылад імітавалі дэсантаванне з вышыні.

— Сёлета мы прынялі рашэнне максімальна задзейнічаць першакурснікаў, — працягвае Юрый Гуляка. — Справа ў тым, што курсанты чацвёртага курса зараз праходзяць практыку, а друга- і трэцякурснікі знаходзяцца на адпачынку. Першакурснікі якраз вярнуліся з вакацый. Усяго ў розных нумарах будзе задзейнічана каля паўсотні чалавек. Некалькі рэпетыцый ужо прайшло ў Палацы Рэспублікі. Аднак пачынаюцца яны менавіта ў гэтых сценах.

Актавая зала Акадэміі МУС, у якой працуюць культарганізатар і прафесійны гукааператар, укамплектавана сучаснай гукавой і асвятляльнай сістэмамі. Рэстаўрацыя старога клуба скончылася да 60-годдзя заснавання навучальнай установы. Імі можна дыстанцыйна кіраваць прама з аператарскай. Дарэчы, 1 сакавіка ў ёй выступіў духавы аркестр ГУУС Мінгарвыканкама. Цікавы факт: партэр актавай залы знаходзіцца глыбей, чым размешчаная побач станцыя метро «Плошча Перамогі».

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

Профі

# З ПРАКТЫКІ МАЁРА РАЯ

## Як знайсці падыход да падлетка?

**Памыліцца ў жыцці можа кожны. Але вельмі важна дапамагчы чалавеку выправіць хібу, пакуль яна не перарасла ў нешта большае. Адзін з краевугольных камянёў у гэтай стратэгіі — паважлівае стаўленне да свайго візаві, кім бы ён ні быў. Гэтай тактыкі прытрымліваецца начальнік інспекцыі па справах непаўналетніх міліцыі грамадскай бяспекі АУС Жыткавіцкага райвыканкама маёр міліцыі Уладзімір РАЙ. У афіцэра мы распыталі, наколькі цяжка працаваць з падлеткамі ў невялікім горадзе.**



### «З дзяўчатамі працаваць прасцей»

Уладзімір Рай прыйшоў у міліцыю не адразу. Спачатку ён скончыў Мазырскі педагагічны ўніверсітэт. Пасля размеркаваўся ў спартыўную школу на сваю радзіму ў Жыткавічы. А пасля надышоў этап, які бывае ў жыцці кожнага хлопца, — павестка ў ваенкамат. Нашага героя прызналі прыдатным да службы і накіравалі служыць ва ўнутраныя войскі на год. Гэта і падштурхнула да таго, каб змяніць прафесію. Дзесяць гадоў адпрацаваў участковым інспектарам. Тры гады таму ўзначаліў інспекцыю па справах непаўналетніх.

— Але навыкі, атрыманыя калісьці ва ўніверсітэце, вельмі дарэчы пры рабоце з падлеткамі цяпер. Ёсць жа вядомае правіла: у вас ніколі не будзе другога шанцу зрабіць аб сабе першае ўражанне, — заўважае Уладзімір Рай. — І наша задача — не запалохаць хлопчыка ці дзяўчынку, а даць ім зразумець, што мы хочам дапамагчы ім як мага хутчэй выйсці з крывой дарожкі. Які ж самы лепшы вынік гэтай работы можа быць? Канешне, калі юнак больш не парушае закон, гэта добра. Але калі ён цябе сустракае на вуліцы і вітаецца, дзеліцца сваімі праблемамі, перажываннямі, то гэта вельмі дарагога варта. Ёсць хлопцы, якія паехалі вучыцца ў іншыя гарады, атрымалі адукацыю, працаўладкаваліся. Я рады за іх, што яны збочылі з пакручастай сцяжыны, што ў іх усё атрымалася. Не засталіся сам-насам з праблемай.

Калі ж звяртацца да кантынгенту, з якім даводзіцца працаваць інспектарам па справах непаўналетніх, то суадносіны хлопчыкаў і дзяўчынак размяркоўваюцца прыкладна 80/20 — закон Парэта працуе і тут. Пераважна падлеткі незалежна ад полу трапляюць у поле нашага зроку праз злоўжыванне спіртнымі напоямі ці дробныя крадзяжы. Апошнім часам набіраюць папулярнасць крадзяжы пры дапамозе камп'ютарных тэхналогій і язда за рулём без правоў.

Але ёсць і адрозненні.

— Напрыклад, быў у нас выпадак, калі дзве дзяўчыны «не падзялілі» хлопца і пабіліся на дыскатэцы. На шчасце, справа скончылася няцяжкімі пашкоджаннямі. Але гэтага хапіла, каб атрымаўся склад злачынства. Адначасова трэба адзначыць, што з дзяўчатамі і працаваць прасцей, — кажа Уладзімір Рай. — Яны больш дарослыя ў псіхалагічным плане. І вось не прыпомню тых, якія б здзейснілі рэцыдывы. Наадварот, яны пасля ствараюць сем'і і жывуць звычайным жыццём...

### «Маці сама старалася дапамагчы сыну трапіць у «спецшколу»

А вось наступная гісторыя здаецца на першы погляд парадаксальнай.

— Мы можам накіраваць падлетка, які не раз парушыў закон, на год у спецыяльную навучальную ўстанову закрытага тыпу — так званую спецшколу. Дык вось, у маёй практыцы быў выпадак, калі маці старалася ўсяляк дапамагчы сыну трапіць туды і сама збірала пэўную частку дакументаў, у тым ліку ў паскораным парадку. Здавалася б, як такое можа быць? А разгадка простая, калі паглядзець на біяграфію падлетка. Яму тады было 16 гадоў. Пасябраваў з алкаголем, трапіў у дрэнную кампанію. Нейкім іншым шляхам ізаляваць ад яе проста не атрымлівалася. Праз гэта здзяйсняў дробныя правапарушэнні. Яго папярэджвалі аб тым, што ён можа адправіцца ў спецшколу, але «жоўтая картка» хлопца не спыніла... Увогуле, Жыткавіцкі раён насамрэч — не вельмі ціхі ў плане падлеткавай злачыннасці, — лічыць Уладзімір Рай. — Мы знаходзімся на стыку трох абласцей, што накладвае сваю спецыфіку. Напрыклад, аднойчы аказвалася, што падлеткі з суседняй Століншчыны любяць ездзіць да нас, кіруючы аўтамабілем, але, натуральна, не маючы правоў.

— З падлеткамі, якія аднойчы аступіліся, трэба працаваць. Машыну часу, каб адагнаць падзеі назад і не парушаць закон, пакуль не вынайшлі. А значыць, трэба правесці разбор таго, што адбылося. І, канешне ж, зрабіць «заданне на заўтра» — каб юнак ці дзяўчына больш не траплялі ў поле зроку міліцыянераў.

— Чамусьці існуе думка, што інспектары па справах непаўналетніх спрабуюць уздзейнічаць на дзяцей, чытаючы ім нудныя натацыі. Насамрэч гэта далёка не так. Канешне, мы праводзім прафілактычныя гутаркі, але ў любым разе прапануем не маналог, а дыялог. Напрыклад, паглядзелі фільм прававой скіраванасці і тут жа яго разам абмеркавалі, знайшлі адказы на ўсе пытанні, — заўважае Уладзімір Рай. — А каб стаць бліжэй да падлеткаў, рэгулярна праводзім спартыўныя турніры. Як толькі юнак да нас трапляе, мы распытваем пра яго зацікаўленасці і пасля ствараем невялікія каманды. Былі ў нас спаборніцтвы па футболе, міні-футболе, валейболе. Праўда, цяпер, пакуль зіма і каранавірус, гэта пастаўлена на паўзу. Хоць улетку, напрыклад, праводзяцца турыстычныя злёты на абласным узроўні. А Светлагорск рэгулярна прымае турнір па міні-футболе. Таксама стараемся зладзіць экскурсіі для нашых падапечных.

— Наколькі складана знайсці падыход да падлеткаў? Кожны з іх — індывідуальнасць...

— У нас тры інспектары па справах непаўналетніх. Раз на месяц абавязкова сустракаемся з дзецьмі. Сказаць па праўдзе, складана працаваць з замкнутымі хлопчыкамі і дзяўчынкамі. Мы не стараемся іх неяк запужаць, не, а размаўляем на роўных. Існуе думка, што калі падлетак трапіў да нас, то гэта ставіць нейкае кляймо на яго далейшым жыццёвым шляху. Насамрэч гэта зусім не так. Улік быў адменены некалькі гадоў таму. Умоўна кажучы, папрацавалі год з падлеткам, ён прызнаў, што памыліўся, больш закон не парушае — і мы да яго прэтэнзій не маем...

### «Сваяк» ідзе ў лузу

Ва Уладзіміра Рая ёсць незвычайнае на першы погляд захапленне ў вольны час — разьба па дрэве. Некалькі гадоў таму ён зрабіў нават більярдны стол. Спатрэбілася на гэта каля двух тыдняў — вольнага часу праз працу і клопаты па доме, на жаль, застаецца не так шмат. Каля тыдня сышло на крэсла-качалку. Шмат дробных вырабаў раздаў родным, блізкім, сваякам...

— Гуляць у більярд пачалі з сябрам яшчэ ў школьныя гады. Вельмі падабаўся працэс разліку ўдару, перамяшчэння ўздоўж стала... Аднойчы я сядзеў у інтэрнэце, дзе глядзеў навучальныя відэа па тэме «зрабі сам». Адзін з ролікаў і дэманстраваў, як самому зрабіць більярдны стол. І неяк я гэтай ідэяй захапіўся, — прыгадвае Уладзімір Рай. — Але ледзь знайшоў вольны час для работы. А тут неспадзявана паўстала праблема з выбарам памяшкання. Більярдны стол сам па сабе не такі маленькі па памерах, а яшчэ вакол жа яго трэба ўвесь час хадзіць і не адчуваць ніякіх перашкод. Прыбаўленне ў сям'і падштурхнула да таго, каб пабудаваць у доме другі паверх. Вось стол там і «прапісаўся». У рускі більярд гуляю я з сябрамі, дзеці таксама вучацца... Насамрэч гульня вельмі карысная. Развівае вакамер, аналітычныя здольнасці, ды і часам можа вельмі заспакоіць і дапамагчы сабрацца з думкамі.

**Фота з архіва героя.**



Ракурс

# ЗІРНУЦЬ ПРАЗ АБ'ЕКТЫЎ

**У Міністэрстве ўнутраных спраў узнагародзілі фіналістаў конкурсу на найлепшыя фота- і відэаработу аб дзейнасці органаў унутраных спраў і ўнутраных войскаў. Усяго на конкурс было даслана больш за тысячу работ — здымкаў і ролікаў. Журы мусіла адабраць з іх найбольш кранальныя і запамінальныя.**

Пераможцаў вітаў **намеснік міністра ўнутраных спраў — начальнік крымінальнай міліцыі Генадзь КАЗАКЕВІЧ.**

— Вашы работы прымусілі нас паглядзець на сваю працу збоку. Вельмі важна, каб яна ўспрымалася людзьмі як нешта абсалютна натуральнае, бо ахоўваць грамадскі парадак, змагацца са злачыннасцю, абараняць людзей неабходна ў любой дзяржаве. Увогуле, конкурс з'яўляецца часткай вялікай інфармацыйнай работы Міністэрства ўнутраных спраў. Наша задача — не толькі сфарміраваць станоўчы вобраз ведамства, асвяціць праваахоўную тэматыку, але і стварыць у беларусаў перакананасць у тым, што МУС з'яўляецца часткай грамадства.




Фота МУС.

У намінацыі «За мірную Беларусь!» аўтары распавядалі пра дзейнасць міліцыі і ўнутраных войскаў па падтрыманні міру і бяспекі ў Беларусі. Яшчэ адна намінацыя, «Шлях да зорак», была прысвечана дзецям, якія хочуць у будучыні стаць міліцыянерамі.

Адным з лаўрэатаў конкурсу стала супрацоўніца Дубровенскага аддзела дэпартамента аховы Святлана Дзяржыцкая.

— Сын Мікіта калісьці хацеў стаць міліцыянерам, але, на жаль, планы давялося крыху змяніць. Але, нягледзячы на ўсё, трэба ж ісці да мары. І вось мы зрабілі фотагісторыю аб тым, як сабака дапамагае маленькаму сышчыку знайсці згубленую цацку...

Іншыя намінацыі былі прысвечаны дарожнай бяспецы, выхаванню дзяцей, а таксама гісторыі праваахоўных органаў.

**Матэрыялы падрыхтаваў Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

# ПРА СВАЕ ДАХОДЫ ЛЕПШ НЕ ЗАБЫВАЦЬ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Хто павінен падаць падатковую дэкларацыю за 2020 год і заплаціць падаходны падатак? Якія даходы неабходна дэклараваць? Якія льготы прадугледжаны для розных катэгорый грамадзян? І якімі спосабамі прадстаўлення дэкларацыі і аплаты падаходнага падатку могуць скарыстацца нашы людзі? На гэтыя і іншыя пытанні адказаў **начальнік Галоўнага ўпраўлення падаткаабкладання фізічных асоб Міністэрства па падатках і зборах Андрэй КАВАЛЕЎСКІ** падчас анлайн-канферэнцыі на сайце БелТА.

## ПРА ДАХОДЫ З-ЗА МЯЖЫ

У лік тых, хто павінен прадставіць дэкларацыю, уваходзяць грамадзяне, якія атрымліваюць даходы за мяжой або з-за мяжы. Гэта значыць, калі фізічная асоба ў 2020 годзе больш чым 183 дні знаходзілася на тэрыторыі нашай краіны, яна прызнаецца падатковым рэзідэнтам Беларусі і павінна даць справаздачу аб даходах, атрыманых за мяжой. А калі чалавек пражываў больш чым 183 дні за межамі краіны, па даходах даваць справаздачу яму не патрабуецца. Яны абкладаюцца падаткам у краіне, дзе ён знаходзіўся.

Асноўная маса даходаў з-за мяжы — гэта заработная плата, дывідэнды, працэнты па рахунках і ўкладах у замежных банках, выйгрышы ў анлайн-казіно і на рынку Форэкс. Вялікі пласт займаюць і грашовыя пераводы ад іншых грамадзян. Калі гэта блізкія сваякі (бацькі, дзеці, родныя браты і сёстры, дзядулі і бабулі, унукі), то падаходным падаткам такія даходы не абкладаюцца, незалежна ад іх памеру, і падаваць падатковую дэкларацыю не патрабуецца. Тое ж адносіцца і да блізкіх сваякоў мужа ці жонкі. Калі ваша цешча вам нешта падорыць з-за мяжы, вы падатак з гэтай сумы плаціць не будзеце.

Падарункі ад асоб, якія не адносяцца да блізкіх сваякоў, абкладаюцца падаходным падаткам. Але ёсць падатковая льгота: сума да 7003 рублёў, атрыманая летась, падаткам не абкладаецца. Гэта значыць, падсумоўваем усе падарункі за 2020 год ад сяброў з-за мяжы і вызначаемся. Калі атрымалася менш за 7 тысяч рублёў, то не трэба падаваць дэкларацыю і плаціць падатак. Калі выйшла больш, то дэкларацыя падаецца толькі ў дачыненні да сумы перавышэння і з гэтай жа сумы выплачваецца падаходны падатак. Значыць, калі вам падарылі 10 тысяч рублёў, то вы плаціце падатак з 3 тысяч рублёў.

Вельмі часта грамадзяне атрымліваюць розныя пераводы з-за мяжы. З кожнага такога перавода трэба плаціць падатак?

Тут ёсць асаблівасць, тлумачыць наш эксперт. Калі гэта перавод ад фізічнай асобы, якая з'яўляецца блізкім сваяком, то гэта не абкладаецца падаходным падаткам. Калі перавод прыйшоў ад сяброў, — схема тая ж, што і з падарункамі — гранічная лічба: 7003 рублі. Але калі гэта перавод не ў падарунак, а за нейкія выкананыя работы, аказаныя паслугі альбо гэта зарплата з арганізацыі, дывідэнды, то абкладаецца кожны атрыманы з-за мяжы рубель.

Бываюць сітуацыі, калі грамадзяне працавалі некалькі месяцаў за мяжой і ў іх у замежнай дзяржаве, як мае быць, таксама ўтрымалі падаходны падатак. Узнікае пытанне з падвойным падаткаабкладаннем. Ужо, напрыклад, у Расіі ці ў іншай краіне заплацілі падатак, дык неабходна паўторна плаціць падатак яшчэ і ў Беларусі?

У гэтым выпадку падатковыя кодэксы і пагадненні аб пазбяганні двайнога падаткаабкладання прадугледжваюць, што Беларусь залічыць суму падатку, выплачаную ў іншай дзяржаве, але пры ўмове прадстаўлення дакументаў, якія пацвярджаюць, што падатак у той краіне быў утрыманы. Гэты дакумент павінен быць завераны падатковай службай іншай дзяржавы.

## ЛІЧЫМ ПРАДАДЗЕНЫЯ МАШЫНЫ, КВАТЭРЫ І ДАМЫ

Наступная вялікая катэгорыя плацельшчыкаў — асобы, якія атрымліваюць даходы ад продажу нерухомай маёмасці і транспартных сродкаў. Але тут таксама ёсць асаблівасці. Калі на працягу года прададзена два і больш легкавых аўтамабілі, то з другой і наступных аўтамашын трэба выплачваць падаходны падатак. Калі прададзены грузавы аўтамабіль масай звыш 3,5 тоны або аўтобус з больш чым 8 пасадачнымі месцамі, то нават адна адзінка гэтай маёмасці абкладаецца падаткам.

Што датычыцца нерухомасці, тут гаворка ідзе не пра адзін, а пра пяць гадоў. Калі на працягу пяці апошніх гадоў прададзена дзве кватэры, два жылыя дамы, два зямельныя ўчасткі, даходы ад другога аб'екта продажу абкладаюцца падаткам. Але гэта датычыцца дзвюх аднатыпных адзінак маёмасці, напрыклад, дзвюх кватэр. А калі прададзеныя, напрыклад, кватэра і жылы дом, ні тое ні другое не абкладаецца падаткам.

Варта адзначыць адзін важны момант пры продажы нерухомасці. Ільгота па адным адчужэнні даецца толькі ў дачыненні да кватэр, жылых дамоў, садовых домікаў (дач), зямельных участкаў, гаражоў і машына-месцаў. Калі прадаецца любая іншая нерухомасць, напрыклад камерцыйная (офісы, гандлёвыя будынкі), то нават аднаразовы продаж абкладаецца падаткам.

У падатковым заканадаўстве прадугледжана даволі вялікая сістэма розных падатковых ільгот і вылікаў. Напрыклад, калі чалавек на працягу года прадаў два легкавыя аўтамабілі, гэта не значыць, што ўся сума з продажу другой машыны абкладаецца падаходным падаткам. У гэтым выпадку ўлічваюцца выдаткі, звязаныя з купляй аўтамабіля.



Напрыклад, чалавек у пачатку 2020 года прадаў аўтамабіль і купіў новы за 10 тысяч рублёў. Ён паездзіў, яму не спадабалася, і машыну зноў прадаў. Атрымліваецца, што ў яго на працягу года адбылося два продажы, і з другога ён павінен заплаціць падатак. Напрыклад, ён прадаў другую машыну за 11 тысяч рублёў. Адпаведна, падатак ён будзе выплачваць толькі з розніцы — з 1 тысячы рублёў. А калі чалавек прадаў машыну танней, чым набыў, то падатку ў яго наогул не будзе, паколькі выдаткі перавышаюць даходы. Але прадстаўляць дэкларацыю неабходна і ў гэтым выпадку.

Выдаткі на нерухомую маёмасць, транспартныя сродкі неабходна пацвердзіць дакументальна: прынесці дагавор на куплю, на будаўніцтва, плацежныя дакументы. Але ў Падатковым кодэксе ёсць яшчэ дзве важныя нормы. Калі ў чалавека дакументы не захаваліся, то ў падатковай могуць быць звесткі, прадстаўленыя дзяржорганамі, аб памеры выдаткаў. Напрыклад, чалавек набыў аўтамабіль, паставіў яго на ўлік у ДАІ, падаў туды дакументы, і супрацоўнікі ДАІ ўнеслі звесткі, што машына была набытая за 10 тысяч рублёў. Потым чалавек дагавор страціў. Ён звяртаецца ў падатковы орган, там глядзяць базу даных ДАІ і нават пры адсутнасці дакументаў гэтыя выдаткі чалавеку ўлічваюць. У самым крайнім выпадку, калі няма дакументаў і падатковы орган не можа ніяк афіцыйна атрымаць гэтыя звесткі, тады падатковае заканадаўства прадугледжвае вылік — 20 % не абкладаць падаткам.

Ёсць яшчэ адзін нюанс. Чалавек мог купіць маёмасць 10 гадоў таму за зусім іншыя грошы, а прадае сёння. Таму Падатковы кодэкс прадугледжвае механізм асучаснівання выдаткаў на нерухомасць і транспарт. Выдаткі грамадзяніна пералічваюцца ў долары ЗША па курсе Нацбанка на дату расходавання, а потым аднаўляюцца назад у беларускія рублі на дату продажу.

У падатковым заканадаўстве існуе яшчэ адна істотная льгота. Калі прадаецца любая маёмасць, атрыманая ў спадчыну, то даходы ад яе продажу не абкладаюцца падаходным падаткам. Калі дзве кватэры прадалі, але адна з іх была атрымана ў спадчыну, то падатак плаціць не прыйдзецца. Гэтая норма датычыцца нават камерцыйнай нерухомасці, якая абкладаецца з кожнай здзелкі. Значыць, калі грамадзянін атрымаў у спадчыну нейкі офісны будынак і яго прадае, адпаведна, падатак таксама плаціць не трэба.

## ДЭКЛАРАЦЫЯ: ЛЕПШ У ЭЛЕКТРОННЫМ ВЫГЛЯДЗЕ

Андрэй Кавалеўскі адзначае, што фактычна ёсць тры асноўныя спосабы падачы падатковай дэкларацыі: асабіста шляхам наведвання падатковага органа, па пошце і ў электронным выглядзе. У першым выпадку фізічная асоба запаўняе дэкларацыю і з пашпартам звяртаецца ў падатковы орган. У нас дзейнічае прынцып экстэрытарыяльнасці абслугоўвання. Гэта значыць чалавек звяртаецца ў любую інспекцыю незалежна ад таго, дзе ён пражывае, дзе зарэгістраваны, дзе знаходзіцца на падатковым уліку. Напрыклад, калі вы прапісаныя ў Віцебску, але жывяце і працуеце ў Мінску, можаце спакойна звярнуцца ў любую падатковую, як вам будзе зручна. Там усё зробяць, паведамленне на выплату вы атрымаеце.

Другі спосаб — падача дэкларацыі праз паштовую сувязь. З любой даведачнай сістэмы альбо з афіцыйнага сайта падатковых органаў можна спампаваць бланк дэкларацыі, запоўніць яго ўручную або на камп'ютары, раздрукаваць, падпісацца і накіраваць па пошце. У гэтым выпадку дата падачы дэкларацыі — гэта дзень паштовага адпраўлення. Калі хтосьці не паспявае звярнуцца ў падатковы орган, ён можа 31 сакавіка адправіць дэкларацыю. Нягледзячы на тое што яна прыйдзе ўжо ў красавіку, тэрмін не парушаецца.

Самы перспектыўны на сёння спосаб — падача ў электронным выглядзе. Тут ёсць важная асаблівасць. Чалавеку неабходна аднаразова звярнуцца ў любы падатковы орган з пашпартам, каб зарэгістравацца ў асабістым кабінеце плацельшчыка, атрымаць уліковы запіс і пароль. Вялікая перавага ў тым, што дэкларацыю ў электронным выглядзе можна падаць з любога пункта свету, не трэба нікуды ездзіць. Другі вельмі важны плюс у тым, што такім плацельшчыкам бліжэй да канца студзеня ўжо даецца папярэдне запоўненая форма дэкларацыі. Гэта значыць, там ужо ёсць усе персанальныя даныя і ўся наяўная ў падатковых органаў інфармацыя (аб даходах з-за мяжы, аб продажы транспартных сродкаў і нерухомасці). Чалавеку трэба праглядзець даходы, прыбраць тое, што не абкладаецца падаткам, напрыклад пераводы ад блізкіх сваякоў. Калі нейкіх звестак недастаткова, трэба дапоўніць іх і адправіць. Грамадзяніну не патрэбен ключ электроннага лічбавага подпісу, яму дастаткова мець уліковы запіс і пароль. Гэта вельмі зручна.

Паведамленне на выплату падаткаў таксама прыйдзе электронным спосабам: яно можа прыйсці як у асабісты кабінет, так і на адрас электроннай пошты, які пакідаецца пры рэгістрацыі. Меню асабістага кабінета дае мноства магчымасцяў. Адтуль можна аплаціць падатак пры наяўнасці банкаўскай карткі і інтэрнэт-банкінгу шэрагу беларускіх банкаў. Падаў дэкларацыю ў электронным выглядзе, такім жа спосабам атрымаў паведамленне, зайшоў у асабісты кабінет, бачыш суму падатку і аплачваеш. Таксама ў асабістым кабінеце можна ўбачыць і стан разлікаў з бюджэтам.

## ВЯРТАННЕ АД ALIEXPRESS

Андрэй Кавалеўскі адказаў на спецыфічнае пытанне, якое звязана з дэклараваннем.

***— Пры вяртанні тавару з замежнай інтэрнэт-крамы і, адпаведна, выплачаных за яго сродкаў ці могуць кантрольныя органы палічыць вернутыя грошы як даход, атрыманы з-за мяжы?***

Наш эксперт адзначае, што вяртанне ўласных сродкаў не з'яўляецца даходам і падаткаабкладанню не падлягае. Па заканадаўстве беларускія банкі, аддзяленні паштовай сувязі прадстаўляюць у падатковыя органы звесткі аб усіх грашовых пераводах, якія паступілі з-за мяжы. Гэта могуць быць і зарплата, і падарункі, і пазыкі, і дывідэнды, і выйгрышы, і ў тым ліку вяртанне ўласных сродкаў з розных гандлёвых пляцовак. Гэта Wildberries, AliExpress ці нават вяртанне ад Uber.

Гэта значыць уся інфармацыя аб любым залічэнні з-за мяжы паступае ў падатковыя органы. Але тое не азначае, што гэтыя сумы адразу абкладаюцца падаткам. У заканадаўстве выразна вызначана: прыбытак — гэта эканамічная выгада. Тут ідзе вяртанне ўласных сродкаў, таму што не падышоў тавар ці не прыйшла пасылка, або неабгрунтавана былі спісаныя грошы за паездку, якая не адбылася. Паколькі падатковыя органы ўсю гэтую інфармацыю размяшчаюць у асабістым кабінеце плацельшчыка, чалавек, адкрываючы дэкларацыю, сапраўды можа ўбачыць там Wildberries, AliExpress або Uber. Але ён сам ведае, што гэта вяртанне грошай, таму ён смела гэта выдаляе з праекта падатковай дэкларацыі і да яго ніякіх прэтэнзій няма. Падаваць дэкларацыю толькі з-за такіх зваротаў чалавеку не патрабуецца. Яны падаткам не абкладаюцца.

Але падатковыя органы ў рамках мерапрыемстваў па кантролі за аплатай падаткаў могуць накіраваць чалавеку ліст і папрасіць даць каментарый, што гэта за даход. І чалавеку дастаткова будзе проста гэта пракаментаваць. Тое можна зрабіць анлайн праз асабісты кабінет. Калі ёсць магчымасць, прымацуйце дакументы, якія пацвярджаюць, што першапачатковая адбылася плацеж.

## ВЫНІКІ ЛЕТАШНЯГА ДЭКЛАРАВАННЯ

Андрэй Кавалеўскі адзначае, што летась у тэрмін было пададзена крыху больш за 31 тысячу дэкларацый. Шэраг грамадзян не падалі дэкларацыю ў тэрмін з розных прычын: хтосьці не ведаў, хтосьці забыўся, хтосьці гэта не зрабіў наўмысна. Па выніках праведзеных падатковымі органамі мерапрыемстваў дадаткова крыху больш за 3 тысячы грамадзян прыцягнута да падаткаабкладання. Калі казаць аб сумах, летась на падставе прадстаўленых дэкларацый грамадзяне заплацілі 76 млн рублёў падаходнага падатку.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# Супрацоўнічаць нельга змагацца

## Затапленні, бязладдзе ў дварах, зацягванне графікаў

Згодна з Дзяржпраграмай «Камфортнае жыллё і прыстойнае асяроддзе», за 2021—2025 гады ў краіне плануецца капітальна адрамантаваць 3,5 млн м² жылля. А Дзяржпрагама «Будаўніцтва жылля» мае на мэце за гэты час стварыць 4 млн м² новабудоўляў. Толькі вось дасягнуць гэтых лічбаў на практыцы цяжка. Прычым не выключна з-за фінансавання, але і з-за праблем ад уласнікаў жылля, адзначылі эксперты.

Колькасць аб'ектаў па капрамонце займае прыкладна чвэрць ад усіх, за якімі сочыць Дзяржбуднагляд. З больш як 10 400 зарэгістраваных летась 2495 — гэта аб'екты капрамонту. Аднак у эксплуатацыю ўведзена 1214 з іх, расказаў **Ігар ГУСЕЎ, дырэктар Дэпартамента кантролю і нагляду за будаўніцтвам Дзяржстандарта.**

Асноўная праблема — затапленне грамадзян падчас рамонту даху як вынік парушанай тэхналогіі работ. Тое ж адбываецца і падчас знадворных работ на сценах. Напрыклад, адрамантуюць фасад, а пасля бяруцца за балконы, што нясе дадатковыя затраты па інжынерных сетках. Недацягвае і культура правядзення капрамонту: адсутнасць парадку на дваровых тэрыторыях, агароджы пляцоўкі, своечасовага вывазу смецця. А добраўпарадкаванне прылеглай дваровай тэрыторыі і пад'ездаў увогуле рэдка ахопліваецца праектнай дакументацыяй.

*— У краіне 740 дамоў звышнарматыўнага жылля з капрамонтам, палова з якіх то будуецца, то не. З жыхарамі ідуць суды з-за недавання доступу ў кватэры. На многіх аб'ектах падрадчыкі неарганізаваныя: не вытрымліваюць графікі правядзення работ, робяць неабгрунтаваныя перапынкі ў рабоце. Тыповыя парушэнні пры гэтым — несвоечасовае закладванне адтулін у сценах і перагародках пры замене інжынерных камунікацый. Найбольш такіх аб'ектаў, дарэчы, у сталіцы і Магілёўскай вобласці,* — выказаўся Ігар Гусеў.

Супрацоўнікі Дзяржбуднагляду падчас рэйдаў летась праверылі 1517 будпляцовак на аб'ектах капрамонту. 65 % з іх не адпавядала нормам — інспектары выявілі 1216 розных дэфектаў. Да адміністрацыйнай адказнасці прыцягнута 191 службовая і юрыдычная асоба, паведаміў дырэктар дэпартамента:

*— У краіне зацверджана 48 будаўнічых нормаў і 12 будаўнічых правілаў, якія рэгламентуюць патрабаванні да асобных відаў работ, але пакуль не распрацаваныя новыя дакументы да капрамонту. Патрабаванні па капрамонце рэгламентуюцца ТКП 45-1.04-206-2010 «Рамонт, рэканструкцыя і рэстаўрацыя будынкаў і збудаванняў. Правіла праектавання», ТКП 45.1.04-104-2008 «Праектная дакументацыя на рамонт, мадэрнізацыю, рэканструкцыю жылых і грамадскіх будынкаў», аналагічны ТКП дзейнічае на сістэмы ацяплення і вентыляцыі. Зараз гэтыя дакументы перапрацоўваюцца ў будаўнічыя нормы.*

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**



Падчас «круглага стала».

Фота БелТА.

## Небяспечны? Рамантаваць! Не? Ісці насустрач!

Каб капітальны рамонт не станавіўся для ўласнікаў камунальным пеклам, трэба падыходзіць да кожнай сітуацыі індывідуальна. Плануючы перапрацаванне балкона згодна з праектам, трэба зыходзіць з таго, ці ўяўляе ён небяспеку. Калі, скажам, там можа абваліцца агароджа, то яго трэба рамантаваць. Калі не, то аб'ектыўна варта пайсці насустрач уласніку і не чапаць канструкцыю, калі жыхаром там зроблены рамонт. І навошта мяняць тую раму, калі яна не адпавядае нормам па вышыні, аднак канструкцыя якасная, разважаюць эксперты.

*— Давайце размяжоўваць паняцці «капітальны рамонт як жыллёва-камунальная паслуга, на якую грамадзяне адлічваюць сродкі», і «капітальны рамонт як від будаўніцтва». Апошняе рэгулюецца Міністэрствам архітэктуры і будаўніцтва з дапамогай будаўнічых правілаў і нормаў. Перапрацоўваецца ТКП № 206, дзе ўжо будуць абазначаны асаблівасці правядзення капітальнага рамонту. Гэта датычыцца, напрыклад, і цеплавузлоў, якія павінны захоўваць абазначаныя памеры. Асаблівасці трэба ўлічваць,* — прапанаваў **Аляксей ПРАЦЬКО, начальнік аддзела эксплуатацыі жыллёвага фонду Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі.** *— Што датычыцца якасці вытворчасці работ, то ў нас ёсць заказчыкі, якія павінны ўлічваць недахопы і рабіць прадпісанні.*

Будаўнічыя нормы, магчыма, варта карэктаваць пад патрэбы капрамонту, бо часам у праект закладваюцца невыканальныя работы, дадаў **Павел ДРАЗДОЎ, намеснік начальніка інспекцыі Дэпартамента кантролю і нагляду за будаўніцтвам па г. Мінску:**

*— Напрыклад, супрацьпажарныя лесвіцы. Можа, увогуле не трэба ўводзіць у праект і не прымушаць іх аднаўляць, калі жыхары іх дэманціравалі, а замест гэтага варта прадугледзець іншыя шляхі для ратавання.*

*— Цяпер, пэўна, можна тэхнічна забяспечыць эвакуацыю грамадзян і без супрацьпажарных лесвіц. Да таго ж у сучасных кватэрах стаяць металічныя дзверы і шклопакеты, якія, нават калі ты спусцішся па той лесвіцы да пятага паверха, не дазволяць трапіць у кватэру да суседзяў, фізічна сіл не хопіць разбіць шкло,* — пагаджаецца і **Цімафей КРЭМЕЗ, галоўны інжынер Мінскай гарадской жыллёвай гаспадаркі.**

## Чые сеткі — той і адказвае

Каб павысіць якасць капрамонту, трэба дакладна размяжоўваць зоны адказнасці, лічыць **Дзяніс ЖАЙМО, дырэктар РУП «Інстытута «Белжылпраект».** Замена камунікацый, што знаходзяцца на балансе пастаўшчыкоў камунальных паслуг, з'яўляецца зонай адказнасці іх балансатрымальнікаў. Гэта і кабельныя сеткі, якія пастаўляюць энергію ў жылы дом, і цепласеткі, і водаправод. І балансатрымальнік павінен мець свой графік на замену гэтых інжынерных камунікацый, якія выйшлі з тэрміну прыдатнасці, заўважыў ён:

*— ЖКГ клапоціцца, каб падчас капрамонту ў жылым доме былі заменены ўнутраныя інжынерныя сеткі са звышнарматыўным тэрмінам выкарыстання (тыя, што ўнутры дома). Павінна быць дакладнае размежаванне, хто за якую частку адказвае і плаціць.*

*— Усе работы, якія падчас капрамонту павінны выконваць балансатрымальнікі, трэба выключыць з праекта капрамонту, і гэты дакумент пасля неабавязкова павінен ізноў праходзіць экспертызу,* — прапанаваў Павел Драздоў.

*— Магчыма, работы па замене камунікацый і не варта выключаць з праекта. Проста затраты на гэтыя віды работ перакладваць на балансатрымальнікаў камунікацый, каб яны вярнулі грошы камунальнікам. Затое дом будзе зроблены якасна і цалкам,* — разважае **Эдуард ГАРДУКЕВІЧ, намеснік генеральнага дырэктара Мінскрамбуда.** *— Забараніць і выключыць прасцей за ўсё, але ў асноўным усё ўпіраецца ў размеркаванне грошай паміж ведамствамі.*

## Не перадпраектны, а дапраектны

Якасць капітальнага рамонту пачынае здаваць пазіцыі ўжо на стадыі даследавання (яшчэ да пачатку праектавання), бо доступ на тыя ж балконы нават праекціроўшчыкі атрымліваюць не заўжды. Яны вымушаны часам абследаваць будаўнічыя канструкцыі з зямлі і ледзьве не з паветра. Каб вызначыць стан балкона, даводзіцца разглядаць яго хіба што не праз прызму магчымасцяў зума фотаапарата. У выніку гэта відавочна ўплывае на якасць праекта. Каб пазбегнуць такога, трэба інфармаваць грамадзян загадзя і прапрацоўваць з імі ўсе пытанні капрамонту да таго, як будзе складзена праектная дакументацыя, прапанаваў Дзяніс Жаймо:

*— Павінна быць не перадпраектная прапрацоўка, а дапраектная — усіх аб'ектаў капітальнага рамонту. Сёння існуе праграма капрамонту на пяцігодку, бягучыя графікі правядзення работ па пэўных дамах. Аднак з насельніцтвам, на жаль, мы пачынаем работу, калі праектная дакументацыя амаль завершана. Трэба памяняць падыход і пачаць загадзя расказваць жыхарам, што ўваходзіць у склад капрамонту, а што — не. Паказваць, якія асноўныя дакументы рэгламентуюць парадак выканання будаўніча-мантажных і праектных работ. Знаёміць з пастановай Саўміна, дзе рэгламентаваны парадак карыстання жылымі памяшканнямі. Там прапісана, хто і калі павінен даваць доступ на лоджыі-балконы для абследавання будаўнічых канструкцый. Калі знаёміць уласнікаў з усімі гэтымі дакументамі, то, мусіць, і праектная дакументацыя будзе якасная, і, адпаведна, такімі будуць будаўніча-мантажныя работы.*



Карпатлівая дыпламатычная работа з жыхарамі і мясцовымі органамі ўлады адымае шмат часу, і галоўная прычына немагчымасці скончыць аб'ект своечасова менавіта ў гэтым, пагадзіўся **Уладзімір КЛІШЭВІЧ, намеснік начальніка інспекцыі Дэпартамента кантролю і нагляду за будаўніцтвам па Мінскай вобласці,** які заўважыў, што *«па Мінскай вобласці летась з 274 аб'ектаў капрамонту здадзена менш за палову»*.

## Вышэйшыя штрафы — большая адказнасць?

Разважаючы над тым, што зрабіць, каб праекціроўшчык не меў праблем з доступам, некаторыя эксперты лічаць — работа з насельніцтвам з дапамогай перніка не дапаможа. Час брацца за бізун.

Сталічныя камунальнікі ўжо прапрацоўваюць магчымасць у перыяд правядзення сходу заключаць з уласнікамі пэўнае пагадненне. Гэта будзе штосьці накшталт памяткі, дзе напісана, якія работы арыенціровачна будуць выконвацца, абазначаны абавязкі па даванні доступу ў кватэру і штрафы за невыкананне гэтага.

*— Чым вышэйшыя штрафы, тым большая адказнасць у жыхароў,* — упэўнены Цімафей Крэмез. *— Вось прапісалі б, напрыклад, што штраф за недаванне доступу тры тысячы рублёў. Пройдзе тры месяцы, скажам, нічога не змянілася — паўторна такі ж штраф.*

З уласнікамі не варта змагацца і заціскаць іх, з імі трэба супрацоўнічаць, мяркуе Дзяніс Жаймо і нагадвае, што асноўны дакумент праекціроўшчыка — заданне на праектаванне:

*— Да гэтага дакумента сёння настолькі адказна ставяцца заказчык, падрадчык (у асобе праектнай арганізацыі) і кожны від работ так кантралюецца пры праходжанні дзяржэкспертызы, што самадурства там ніякага няма. Тое, што прапісана ў заданні на праектаванне, павінна быць у праектнай дакументацыі. І ўжо задача экспертызы адсачыць, ці не закладзена нешта лішняе, і выключыць гэта.*

## Дамы — кварталамі, двары — індывідуальна

Два месяцы таму ў сталіцы быў прыняты рэгламент узаемадзеяння праектнай арганізацыі, заказчыка і ўласніка жылых і нежылых памяшканняў да правядзення праектных работ. Ён зацверджаны намеснікам старшыні Мінгарвыканкама і ўзгоднены з главамі ўсіх раённых адміністрацый Мінска, згадаў Цімафей Крэмез:

*— Мы стараліся прадугледзець усе неабходныя работы, мерапрыемствы і арганізацыю работ з насельніцтвам да пачатку распрацоўкі праектна-каштарыснай дакументацыі. Сёлета ўжо распрацаваны ўсе праекты на гэты год, і амаль на 70 % ад агульнай колькасці — на наступны.*

У наступных праектах камунальнікі ўжо плануюць, як рэалізоўваць капрамонт жылля комплексна, каб зайсці на тэрыторыю і ў некалькіх дамах адразу (двух-трох-пяці) зрабіць рамонт і добраўпарадкаванне тэрыторыі. Прадугледжваецца, што падчас такога паквартальнага рамонту ўсе работы будзе выконваць адна арганізацыя. А вось як будзе добраўпарадкоўвацца тэрыторыя — у межах выканання работ па капрамонце, бягучага ўтрымання або проста бягучага рамонту, трэба будзе вырашаць дакладна па кожным двары.

**Ірына СІДАРОК, фота аўтара.**

Краіна здароўя

Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 311-17-36.

Скажыце, доктар...

# ЗАСНУЦЬ ЗА 60 СЕКУНД

## Што рабіць з бяссонніцай?

**Сон — адна з асноўных патрэб чалавечага арганізма. Калі рэжым збіваецца, вельмі моцна псуецца якасць жыцця. У якіх выпадках мае месца бяссонніца і чым яна адрозніваецца ад нераспазнавання сну? Калі варта біць трывогу і звяртацца да ўрача? Які мусіць быць рытуал адыходу да сну і чаго перад сном лепш не ўжываць? Што дапаможа пазбавіцца ад уздрыгвання падчас засынання? Пра гэта і іншае ў рамках праекта «Марафон жаночага здароўя» расказаў кандыдат медыцынскіх навук, урач-нейролаг, самнолаг Рэспубліканскага клінічнага медыцынскага цэнтра Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта Аляксей МАЛКОЎ.**

***— Што можна лічыць бяссонніцай?***

— Паталагічнай бяссонніцай лічыцца стан, калі чалавек не спіць 3-4 ночы. Такое парушэнне называецца вострай бяссонніцай, або вострым дысамнічным расстройствам. Бяссонніца можа быць і хранічная — калі назіраецца парушэнне сну звыш двух месяцаў.

Норма здаровага сну — ад 6 да 8,5 гадзіны ў суткі, паводле рэкамендацый Еўрапейскай асацыяцыі сну. Калі чалавеку дастаткова 4-5 гадзін, і ён не разбіты, не стомлены, няма парушэнняў дзённай жыццядзейнасці, што з'яўляецца самым галоўным крытэрыем, то ў прынцыпе гэта можна лічыць варыянтам нормы.

Ёсць яшчэ і такі стан, як нераспазнаванне сну. Чалавек кажа: я не сплю дзесяць гадоў — увогуле не засынаю. А потым робіш абследаванне, размаўляеш з пацыентам — і аказваецца, ён спіць свае сем-восем гадзін. Гэта такі стан, які называецца «сны думкі». Наш сон складаецца з хуткай і павольнай фаз. І «сны думкі» — гэта другая, павольная фаза сну, калі чалавек думае і разважае. Нам здаецца, што мы ганяем думкі, а ў выніку мозг расцэньвае гэта як сапраўдны сон. Таму калі чалавек думае, што ў яго бяссонніца, не заўсёды яна сапраўды ёсць.

***— Калі варта біць трывогу?***

— Калі чалавек не можа заснуць доўгі час — тры-чатыры гадзіны. Гэта значыць ён рэальна не спіць — чытае кнігу з уключаным святлом, і сон ніяк не надыходзіць. Гэта называецца прэсамнічная дысамнія — ненаступленне сну. Ёсць стан, які называецца інтрасамнічная дысамнія, — пацыент заснуў на некалькі гадзін, потым прачынаецца і некалькі гадзін не можа спаць. Гэта таксама варыянт бяссонніцы. Але абавязкова і адзін, і другі стан прыводзіць да парушэння дзённага функцыянавання. Такі пацыент стомлены, разбіты, хоча спаць днём. Дык вось калі чалавек не можа на працягу трох-чатырох начэй заснуць, і гэта прыводзіць да парушэння дзённага функцыянавання — ён дрэнна сябе адчувае, то гэта нагода звярнуцца да ўрача.

Бытавая бяссонніца — гэта перыядычнае ненаступленне сну. Інакш кажучы, нейкі час чалавек спіць, потым не спіць, потым зноў спіць нармальна. Гэта стан, які не паўтараецца паталагічна. Ён можа быць звязаны са стомленасцю, стрэсам, праблемамі на рабоце ці дома. Гэта стан, які праходзіць, і тут не патрабуецца лячэнне ці карэкцыя.

***— Якія абследаванні выкарыстоўваюць самнолагі?***

— Залатым стандартам абследавання ў самналогіі з'яўляецца полісамнаграфія. Гэта метад даследавання сну пацыента на працягу ночы з выкарыстаннем камп'ютарных комплексаў. Даследуюцца работа мозга і сэрца, работа брушной поласці і грудной клеткі, насычэнне крыві кіслародам, маюцца датчыкі храпу і спынення дыхання, запісваецца кардыяграма. Акрамя даследавання ўсёй жыццядзейнасці арганізма, мы даследуем сам сон: як пацыент пагружаецца ў сон, як прачынаецца, што яго будзіць, з-за чаго ён не можа заснуць, сапраўды ён не спіць ці гэта ўсё ж такі неасэнсаванне ўласнага сну.

У Мінску полісамнаграфію можна зрабіць і дома, і ва ўмовах стацыянара, як правіла, у палаце з высокім узроўнем камфорту. Гэта добрае, дыягнастычна значнае абследаванне. Часцей за ўсё яно робіцца дома: прыязджае спецыяліст, накладвае датчыкі, чалавек засынае (або не), праз дзевяць гадзін раніцай датчыкі здымаюцца, потым урач расшыфроўвае даныя і ставіць дыягназ.

***— А якія абследаванні трэба зрабіць перад візітам да самнолага?***

— У якасці падрыхтоўкі дастаткова проста сфармуляваць свае скаргі. Ніякіх абследаванняў звычайна рабіць не трэба. Урачу таксама часам хапае звычайнага апытання пацыента. 99 % нашых пацыентаў — гэта людзі з трывожным расстройствам, з саматычнымі кампанентамі. Тыя, хто проста трывожыцца і за кошт гэтага не можа заснуць. Гэта вострая стрэсавая бяссонніца, якая лечыцца за пяць дзён, і ў выніку чалавек здаровы. Але вельмі многа пацыентаў не звяртаецца да ўрача, застаецца без лячэння, не спіць гадамі або спіць пад уздзеяннем вялікай колькасці снатворных, якіх з часам патрабуецца ўсё больш і больш. У выніку займаешся тым, што «здымаеш» іх са снатворных.



У сітуацыйнай бяссонніцы дастатковае лячэнне з дапамогай рэжыму. Ёсць пэўныя правілы адыходу да сну: правятранае памяшканне, выключанае святло, цёплы ложак, зручная поза — у прынцыпе гэтага дастаткова. Пажадана, перад тым як заснуць, выкарыстоўваць рытуал адыходу да сну: вы чысціце зубы — кладзяцеся спаць або з'ядаеце цукерку — кладзяцеся спаць. З часам гэты рытуал будзе асацыявацца з выпрацоўкай мелатаніну — непасрэдна з самім сном.

Усе мы мусім прытрымлівацца пэўнага рэжыму адпачынку. Але ёсць сітуацыі, калі пацыент не можа захоўваць рэжым, напрыклад, з-за начных дзяжурстваў. Тады мы працуем індывідуальна, выбіраем яму розныя рэжымы ў залежнасці ад сітуацыі. Нехта хоча перастроіцца з «савы» на «жаваранка», хтосьці хоча спаць менш ці, наадварот, больш — варыянтаў работы з пацыентамі многа. І канешне, лепш сітуацыю не запускаць.

***— Што не трэба есці ці, наадварот, трэба з'есці перад сном?***

— Перад сном не трэба ўжываць каву і чай, курыць, ужываць алкаголь, бо ён часам выклікае пераўзбуджэнне, не варта есці цяжкую ежу, тлустае, смажанае. Прадуктаў, якія паляпшаюць сон, акрамя гарачага малака, не існуе. Ёсць мікраэлемент, які ўплывае на сон, — гэта магній. Мы назапашваем за дзень эмацыянальную нагрузку і пазбаўляемся ад яе ў сне. Дастаткова дзве таблеткі магнію перад сном, каб зняць пераўзбуджэнне, напрыклад, калі пацыент скардзіцца на яркія сны ці на кашмары. Нехта засынае і пачынае ўздрыгваць — магній пры гэтым таксама добра дапамагае.

У пацыентаў пасля 50 гадоў узнікае дэфіцыт выпрацоўкі мелатаніну — гармону сну, недахват якога не дазваляе пагружацца ў глыбокія фазы сну. У асноўным гэта праблема жанчын у перыяд менапаўзы, калі ёсць яшчэ і прылівы. Прэпараты мелатанінавага рада цалкам могуць дапамагчы такім пацыентам. Добра працуюць і вегетакарэктары — прэпараты, якія стабілізуюць работу вегетатыкі і не даюць эмацыянальнай сферы праяўляць сябе ў начны час.

***— З якімі праблемамі можна звяртацца да самнолага?***

— Усё, што адбываецца з чалавекам падчас сну, — сфера цікавасці гэтага спецыяліста. Нехта ўздрыгвае, задыхаецца ў сне, храпіць, іншым сняцца кашмары, у кагосьці ёсць парушэнне мочаспускання — адсюль частыя ўставанні. Мы займаемся праблемай спынення дыхання ў сне (сіндромам апноэ), усімі парушэннямі сну, бяссонніцай, начнымі эпілепсіямі, начной патлівасцю. Самнолагі — гэта ў асноўным урачы іншых спецыяльнасцяў, як правіла, неўролагі, псіхатэрапеўты, кардыёлагі, якія давучыліся і атрымалі дадатковую спецыялізацыю. Таму ўсім раю звяртаць увагу на тое, як спіце вы і вашы блізкія. Цяпер дастаткова проста звярнуцца да ўрача і вырашыць любую праблему.

## Ці бяспечна прышчэплівацца ад COVID-19?

**На гэтае пытанне, якое хвалюе сёння многіх, адказаў Вячаслаў ГРАНЬКОЎ, каардынатар праграм па інфекцыйных захворваннях краінавага офіса Сусветнай арганізацыі аховы здароўя ў Беларусі.**



— Нягледзячы на тое што вакцыны ад COVID-19 рэгіструюцца ў экстранным парадку ў сувязі з пандэміяй, яны праходзяць усе этапы клінічных выпрабаванняў. І фактар бяспекі з'яўляецца адным з галоўных, які ўлічваецца пры рэгістрацыі вакцын. На сёння ўсе наяўныя даследаванні паказваюць, што гэтыя вакцыны бяспечныя і могуць прымяняцца для масавай вакцынацыі.

Безумоўна, урач перад прышчэпкай ацэньвае фактары рызыкі пацыента, а таксама супрацьпаказанні, паколькі, як і ў любога прэпарату, у вакцыны яны могуць быць. Але тут важна адзначыць, што рызыка непажаданых з'яў, пабочных рэакцый на вакцынацыю заўсёды нашмат меншая, чым рызыка захворвання на COVID-19 і яго ўскладненні.

Жыць з камфортам

# ЯКІЯ ШПАЛЕРЫ НЕ НАШКОДЗЯЦЬ

**Рамонт — складаны працэс, і пры падборы матэрыялаў кожны звяртае ўвагу на іх кошт і зручнасць у карыстанні. А на бяспеку? Пра гэта, на жаль, нярэдка забываюць. Якія матэрыялы бяспечныя і на што звяртаць увагу пры падборы шпалер, расказала ўрач-лабарант Мінскага абласнога цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Святлана КЛІМУК.**

Асаблівай асцярожнасці варта прытрымлівацца пры выбары пакрыцця для сцен спальні, гасцінай ці дзіцячага пакоя, паколькі ў гэтых памяшканнях мы праводзім больш за ўсё вольнага часу. Сярод найбольш бяспечных для здароўя можна вылучыць некалькі відаў насценнага пакрыцця: папяровае, вінілавае і пакрыццё на флізелінавай аснове.

Палатно на папяровай аснове цалкам бяспечнае — папера не вылучае ніякіх шкодных рэчываў, выдатна прапускае паветра. Яно не спрыяе развіццю цвілі і грыбка, адзіны недахоп — недаўгавечнасць. Палотны лёгка рвуцца, малюнак на іх хутка выгарае, мыць іх нельга.

Амаль усіх гэтых недахопаў пазбаўлены палотны на флізелінавай аснове. Флізелін атрымліваюць шляхам праклейвання цэлюлозных валокнаў. Ён па ўласцівасцях падобны на паперу, таксама не вылучае ніякіх рэчываў, «дыхае», у цэлым з'яўляецца бяспечным. Такое аздабленне трывалае, даўгавечнае, адзіны недахоп — немалы кошт.

Вінілавыя пакрыцці пераўзыходзяць паперу і флізелін па трываласці дзякуючы пласту вінілу (полівінілхларыду). Гэтае рэчыва мае цалкам хімічнае паходжанне, не прапускае паветра і вільгаць. З аднаго боку, гэта робіць палатно супертрывалым, з другога — адсутнасць паветраабмену істотна павышае рызыку развіцця цвілі і грыбка. Іншая праблема заключаецца ў тым, што полівінілхларыд можа вылучаць фармальдэгіды, якія адназначна не нясуць карысці для чалавека. Тое, што мы называем вінілам — гэта звычайны пластык, якому з дапамогай фталатаў надалі гнуткасць. У гэтых рэчывах часта ўтрымліваюцца цяжкія металы, якія нясуць найбольшую небяспеку для здароўя. Трэба быць гатовымі да таго, што якасныя і мінімальна шкодныя шпалеры з вінілавым пакрыццём будуць каштаваць дорага.

Таму не варта купляць палотны кітайскіх вытворцаў, бо менавіта іх прадукцыя часцей за ўсё парушае нормы і стандарты. Самы надзейны варыянт — матэрыялы вытворчасці Германіі, Фінляндыі і Швецыі.

Такім чынам, шпалеры з полівінілхларыду нельга назваць цалкам бяспечнымі. Але гэта справядліва для многіх рэчаў, якія прысутнічаюць у нашых кватэрах: мэбля з ДСП, ламінат, некаторыя фарбы таксама вылучаюць фармальдэгіды, але ніхто не спяшаецца цалкам адмаўляцца ад іх. Вось і ад шпалер з вінілавым пакрыццём можна не адмаўляцца зусім, проста выкарыстоўваць іх трэба асцярожна. Гэта значыць, не клеіць іх у дзіцячых пакоях, спальнях і гасцінах. Выкарыстоўвайце шпалеры з ПВХ-пластом у памяшканнях, дзе ёсць добрая вентыляцыя і дзе вы праводзіце мінімум часу. Часцей за ўсё гэта пярэдні пакой і кухня. Тут такое адстройванне дакладна будзе бяспечнае для ўсіх членаў сям'і і вы зможаце адчуць усе яго перавагі, а менавіта — трываласць, даўгавечнасць, устойлівасць да вільгаці і выдатныя дэкаратыўныя ўласцівасці.

З нагоды

# ЛЁСЫ ДЭБЮТНЫХ КНІГ

## Дзеля першай кнігі Канстанцыю Буйло адпраўлялі ў кляштар, а ў Куляшова выкраслілі лірыку

**«Я не самотны, я кнігу маю з друкарні пана Марціна Кухты» — пісаў, паміраючы ў Ялце, «у белым доме ля сіняй бухты», Максім Багдановіч: цешыўся, што ў гэтыя цяжкія хвілі мае пры сабе свой першы, але і, на жаль, апошні паэтычны зборнік «Вянок».**

Процьма цікавых, трагічных, кранальных ці вясёлых гісторый звязана з першымі кнігамі. Расійскі паэт Някрасаў асобнікі свайго дэбютнага паэтычнага зборніка, выдадзенага на ўласныя грошы, выкупіў, каб... знішчыць. Амерыканскі пісьменнік Генры Мілер падпісаў першы свой раман «Молах» прозвішчам жонкі, бо ганарар мусіў выплаціць яе каханак. Іван Бунін першы ўласны паэтычны зборнік рассылаў усім, жадаючым і нежадаючым, бясплатна, з адзінай просьбай: каб пахвалілі — бо надта ж крытыкі задзяўблі.

Ёсць свае незвычайныя гісторыі і ў першых кніг беларускіх літаратараў — і класікаў, і сучаснікаў. Давайце з нагоды Сусветнага дня пісьменніка ўспомнім некаторыя з іх.

### Канстанцыя Буйло. «Курганная кветка»




З дэбютным зборнікам гэтай дваццацігадовай паэткі звязаныя імёны двух самых вядомых беларускіх паэтаў, слыннага мастака і легендарнай мецэнаткі...

Паэтку звалі Канстанцыя Буйло, яна была дачкой Антона Буйло, аб'ездчыка графа Тышкевіча. У родным Вішневе Канстанцыя пасябравала з дачкой настаўніцы французскай мовы Эміліі Станкевіч Уладзіславай. Аднойчы падрослыя Костка і Уладка прыйшлі ў віленскую рэдакцыю «Нашай Нівы», куды Канстанцыя дасылала вершы.

«Нехта, узяўшы мяне за плечы, павярнуў да сябе. Перада мной стаяў высокі, тонкі мужчына, з сінімі вачыма, задумлівы і сур'ёзны. — «Ты, мусіць, Буйлянка, — лагодна сказаў ён мне, — ну а я Купала. Дык давай знаёміцца». І ён, нагнуўшыся, пацалаваў мяне так сур'ёзна і ўрачыста, што я нават не здзівілася, а смяшлівая Уладка не засмяялася. Да гэтага знаёмства яшчэ Купала прысвяціў мне вельмі прыгожы свой верш».

Першая сустрэча ў «Нашай Ніве» завяршылася тым, што Купала прапанаваў юнай госці заначаваць у рэдакцыі, прынёс бутэльку салодкага віна і яблыкаў, і яны да раніцы ўдваіх па чарзе чыталі п'есу «Паўлінка». А калі ў 1914-м Купала стаў галоўным рэдактарам «Нашай Нівы», прапанаваў Канстанцыі падрыхтаваць яе першы зборнік. Працаваў над кнігай «з вялікім замілаваннем, як над сваёй». Вокладку маляваў мастак-візіянер Язэп Драздовіч. На малюнак у стылі ар-дэко яго натхнілі радкі Буйло «Я каханне маё пахаваю ў душы, спакой сфінкса на твар палажу». А сам зборнік называецца «Курганная кветка». Грошы на выданне дала княгіня Магдалена Радзівіл, тая ж, што спансіравала і «Вянок» Максіма Багдановіча. Праўда, у пані былі на юную паэтку свае планы. Калі Буйлянка па запрашэнні княгіні прыехала да яе ў Мінск, пачула наступнае: «Я хачу вам дапамагчы паступіць у Варшаўскі манастыр шарытак. Там вы прабудзеце нейкі час. Калі вырашыце стаць шарыткай, я ўнясу за вас багаты пасаг. Нам трэба мець уплыў на беларускую палітыку».

Разгубленая Канстанцыя, як магла, ветліва адмовілася.

Кніга з'явілася на свет у друкарні Марціна Кухты, Купала, высылаючы аўтарцы асобнікі, пісаў: «Пасылаю табе кніжкі, зрабіў — як умеў. Дрэнная папера, але лепшай не маглі дастаць». Першы — ухвальны — водгук на зборнік таленавітай паэткі напісаў Максім Багдановіч. Як сведчыў Рыгор Шырма, вершы зборніка ў Заходняй Беларусі зрабіліся песнямі, а верш «Люблю наш край», які паклаў на музыку Мікола Равенскі, лічыўся гімнам.

Сяброўка Канстанцыі Уладзіслава Станкевіч у 1916-м стала жонкай рэдактара яе кнігі, Янкі Купалы.

Наступны зборнік Канстанцыі Буйло «Світанне» выйдзе толькі праз 36 гадоў, у 1950-м.

### Яўгенія Пфляўмбаўм. «Вершы»

А вы можаце ўявіць такое, каб паміж першай і другой прыжыццёвымі кніжкамі літаратара прамінула шэсцьдзясят тры гады?




У беларускай літаратуры ёсць і такі феномен.

«Вершы» — так немудрагеліста называлася дэбютная кніга юнай мінскай паэткі Яўгеніі Пфляўмбаўм, складанае прозвішча яна атрымала ў спадчыну ад бацькі-немца, што працаваў на чыгунцы. А ў 1926 годзе рэалізаваўся, як той казаў, першы гендарны праект беларускай літаратуры: пад адной вокладкай у бібліятэчцы «Маладняка» выдалі трох паэтак — сяброўак аб'яднання, самых актыўных і таленавітых. Акрамя васямнаццацігадовай Пфляўмбаўм, гэта былі Зінаіда Бандарына і Наталля Вішнеўская. Рэдактарам зборніка стаў Уладзімір Дубоўка. Шэрая, сціплая брашурка — вялікая надзея для трох аўтарак, і ўсім тром выпаў трагічны лёс. Як пісаў Сяргей Грахоўскі ў вершы, прысвечаным Яўгеніі Пфляўмбаўм:

*«Натхнёна Жэня, Зіна і Наташа*
*Спявалі дзеля шчасця і свята,*
*Але ў злавесны век*
*атруты чаша*
*Іх напаткала і не абышла.*
*Дарогі разышліся назаўсёды,*
*Сарваліся і змоўклі галасы.*
*Нягоды напаўзалі на нягоды,*
*Як майскі снег, як град,*
*як маразы.*

Яўгенія Пфляўмбаўм выйдзе замуж за паэта Максіма Лужаніна, адправіцца за ім у сібірскую ссылку, потым усё сваё доўгае жыццё будзе пісаць у стол. Яе вершы выпадкова знойдзе госць, Аркадзь Куляшоў, захоча выдаць... Не атрымаецца. Яўгенія ўпарта застаецца ў цяні мужа. Толькі ў 1989-м убачыць свет зборнік «Сувой жыцця» з прадмовай Анатоля Вярцінскага, а Максім Лужанін, які перажыў жонку, да канца дзён стане парадкаваць яе чарнавікі.

### Аркадзь Куляшоў. «Росквіт зямлі»

У дужа ранніх дэбютах заўсёды тоіцца небяспека — нярэдка бліскучая першая кніга, на дзіва дарослая для юнага аўтара, аказваецца і апошняй творчай удачай... Але сярод беларускіх класікаў ёсць вундэркінд, якому не пашкодзіла ранняя слава. Хоць яму было ўсяго 16 гадоў, калі выйшаў яго першы паэтычны зборнік — і вучні ягонай школы ў Саматэвічах дзівіліся і захапляліся, асабліва калі знакаміты выпускнік, не нашмат старэйшы за іх, прыязджаў на сустрэчы. Дарэчы, на адной з такіх сустрэч прысутнічаў вучань Саматэвіцкай школы Іван Чыгрынаў, у будучым таксама народны пісьменнік.

Звалі вундэркінда Аркадзь Куляшоў. Сам ён сцвярджаў, што пачаў пісаць вершы ў чатыры гады, праўда, на рускай мове. Дык вось калі сабралася два сшыткі, юны паэт аб'яднаў іх у рукапісны зборнік пад назвай «Собрание сочинений Кулешова несчастного». А першая друкаваная кніга з'явілася, калі аўтар, хоць і юны, паспеў павучыцца ў Мсціслаўскім педтэхнікуме, дзе стварыў гурт «Амсціслаўцы» са Змітраком Астапенкам і Юліем Таўбіным і ўжо ў 12 гадоў дэбютаваў з вершам «Ты мой брат» у Клімавіцкай раённай газеце.




Вось толькі з дэбютным зборнікам, які ўбачыў свет у 1930 годзе пад назвай «Росквіт зямлі», не ўсё атрымалася гладка. Рэдактарам быў Міхась Чарот, які выправіў усё на свой густ і бязлітасна павыкідваў з будучай кнігі шмат вершаў, асабліва лірычных. Куляшоў пакрыўдзіўся. І хоць зборнік прынёс яму славу, адкрыў шмат магчымасцяў, падзагаловак «Першая кніга паэзіі» ён дэманстратыўна паставіў у другім сваім зборніку «Па песню, па сонца!..», які выйшаў у 1932-м, такім чынам нібыта выкрасліў першую сваю кнігу з творчай біяграфіі.

Пасля выхаду зборніка «Росквіт зямлі» Аркадзь Куляшоў пераехаў у Мінск і пачаў вучобу на літаратурным факультэце педінстытута, куды яго адмыслова запрасілі як аўтара папулярнай кнігі. Карацей, усё як у вершы, у якім ён апісаў, як са школьным сябруком курыў у ельніку:

*За дымам думкі следам*
*Плывуць — твая, мая.*
*Ты марыш быць паэтам,*
*Быць трактарыстам — я.*
*Над ельнікам імглістым*
*Плыве за годам год.*
*Стаў друг мой трактарыстам,*
*А я —*
*Наадварот.*

### Васіль Быкаў. «Ход канём»




Мала хто памятае, што першая кніга Васіля Быкава — гэта не ваенная проза. А зборнік фельетонаў, які выйшаў у 1960 годзе ў бібліятэцы сатырычнага часопіса «Вожык». І вось што Быкаў піша пра гэта ў сваіх успамінах:

«Беларускі «Вожык» неўпрыцям пачаў набываць характар, хаця ягоны крытычны пафас і не ўзнімаўся вышэй пасады ўпраўдома. Гэты часопіс надрукаваў штосьць з маіх фельетонаў, і галоўны рэдактар Павел Кавалёў запрасіў у Мінск для знаёмства. (Тады асабістае знаёмства з аўтарам было абавязковае, перад тым вывучаліся яго мінулае, сацыяльнае становішча, партыйнасць.) Прыехаўшы аднойчы па ганарар, пазнаёміўся з Паўлам Нічыпаравічам, а каб замацаваць знаёмства, пайшлі ў рэстаран. Нашай кампаніяй не пагрэбавалі і іншыя працаўнікі «Вожыка», і не толькі сатырыкі. Вынікам таго супрацоўніцтва праз нейкі час стала кніжачка сатырычных апавяданняў пад характэрным назовам «Ход канём».

У кнізе было ўсяго 47 старонак і шэсць апавяданняў: «Арганізатар», «Даведка», «Апендыцыт», «Буйны выйгрыш», «Ход канём» і «Дапякло». Тэмы — бюракратыя, прыстасавальніцтва, начальніцкая фанабэрыя...

А вось кніга, у якой ужо знаёмы нам Васіль Быкаў майстар ваеннай прозы, з'явілася пасля таго як аўтар пабываў на семінары маладых літаратараў у Каралішчавічах. «Пасля семінара з усяго, што ў мяне сабралася, склаў першы зборнік, адаслаў у выдавецтва. Праз нейкі даволі працяглы час яго далі на падрыхтоўку да друку выдавецкаму рэдактару, якім аказаўся Уладзімір Дамашэвіч. Таму давялося не толькі рэдагаваць тэкст, але і адстойваць мае літаратурныя ідэі, якія былі не ва ўсім традыцыйныя і не задавальнялі выдавецкае начальства. Асабліва тое адносілася да аповесці «Жураўліны крык». Але Валодзя меў характар, а галоўнае — уласны пагляд на літаратуру, адрозны ад казённага пагляду шматлікага начальства».

### Рыгор Бярозкін. «Паэзія праўды»

